**Рыгор Барадулін**

# Рум

Нрвая кніга лірыкі

www.kamunikat.org

Мінск
Мастацкая літаратура
1974

# 1

* * *

Мая Радзіма — гэта там,
дзе праплываюць самыя
прыгожыя аблокі.
*Жуль Рэнар*

З-пад нахмураных броваў
даспелага жыта
палыхае блакіт азёр.
Край прыветлівы,
сэрцамі продкаў абжыты,
зноў спазніўся —
прымаю дакор.
Васільковы спакой.
Смутак верасу сіні.
Палыновая памяць тугі.
Без мяне на лугах
мурагі пакасілі.
Без мяне стагавалі стагі.
Без мяне да Пятра
венікаў навязалі —
узялі зялёны аброк
з бяроз.
Адгуло,
адплыло маё лета вазамі —
звонкарэхае, я не збярог.
Белабрысага бору
распагоджаны вырыс.
Нізка дзікія гусі ляцяць.
Толькі дзіву даешся,—

www.kamunikat.org

калі гэта вырас
з камізэлькі сваёй бацян.
Засынае аер,
шлях курыцца далёкі.
Слонку хочацца клікнуць:
— Вуць-вуць!..
Нават страшна дыхнуць —
маладыя аблокі
над Вушаччынай ціха плывуць.

* * *

Рэкі ўсхадзіліся — досыць,
спачылі!
На звонкія крыгі
апрыклы склеп!
На мокрым лузе
статак шпачыны.
Цвіце,
захлынаецца кураслеп.
Недзе ляціць спадарожнік
на Месяц.
Тут бусел,
спрадвечны, як белы свет,
Балацявінку зыбучую месіць,
Ідзе за цыбатым цыбаты след.
Баіцца жаўрук,
што яго не пачулі.
Спрадвечную песню пяе вада.
Кнігаўкі,
верныя звычцы матулі,
Адводзяць бяду
ад свайго гнязда.
Ранак вясновы.
Высновы Айчыны.
Падзолістых скібаў
падзённы хлеб.
На мокрым лузе
статак шпачыны.
Цвіце,
захлынаецца кураслеп.

* * *

Ад сівых гадоў,
ад дзядоў
Для мяне
ашчаджона спадчына:
Песні жніўнай
смутак удоў,
Мох зязюльчын,
гняздо курапатчына;
Сіні верас
і сіні дым,
Зоркі першай
драбнюткая мачына,
Яры хмель
над ярам крутым,
Галубіная мова матчына.
Не згублю яе
ў тлуме дарог,
Дзе маторам
вясёла грукочацца,
Боязна мне
ступаць на мурог —
Прытуліцца шчакою хочацца.
Хай мяне
бласлаляць у нябыт
Як свайго шалапутнага хрэсніка
І яго Яснавокасць
блакіт,
І яе Ласкавасць
бярэзінка.

## 1103-ЦІ ДЗЕНЬ ВАЙНЫ

Ушаччына!
Злыя вятры
Ніколі цябе не абмінулі.
Слязу ўспамінаў сатры,
Салдатаў лясных матуля!

Ты рвалася з тхла
Да святла,
Палегла сыноў нямала:
Зялёнай калыскай
Была,—
Блакаднай магілай
Стала.

Сыны не чакалі спагад,
Трывалі,
Стаялі трывала.
Жалезная воля брыгад
Смяротны ланцуг парвала.

Аглухлы ад кананад,
Пот скрывянелы ўцерці
Выйшаў
Лясны салдат
З блакаднага пекла
ў бяссмерце...

www.kamunikat.org

**ПАПЯРОВЫЯ ЗМЕІ**

Яліны
Вяршалін тупымі штыкамі
Неба апуджанае прапаролі.
Чаго знікае,
Куды ўцякае,
На вечар гледзячы,
Змей папяровы?

Уз'еліся — на неціхоцце —
Сабакі.
Не ные хоць
«Рамы» заклятай прапелер.
Вайна кругом.
Не да забавы!
Скруціць папяроску
Няма паперы.

...А раніцай
Лыпае бельмамі
Сонны
У роспачы гарнізон паліцэйскі:
Як лістоўкі трапілі
З партызанскай зоны?
Як плакаты
Сюды прыляцелі?

...Фюрэр размаляваны адмыслова.
Пра ўдар і размах
Адпаведныя словы.
...Пра тое,
Што ў Вуле
Каменданта ў лапці абулі.
...Як у Камені
Біліся немцы аб раміны...

...Ляціць з Ушачы
Вечаровай парою
Дзіцячая забаўка —
Змей папяровы...

Іду пасёлкам,
Колькі аднасяльчан не далічыўшы.
Над пасляваенным узлескам,
Не разумею,—
Плывуць трывожныя аблачынкі
Ці папяровыя змеі?..

www.kamunikat.org

## НА СУСТРЭЧЫ ПАРТЫЗАН

Вецер супакоіўся на міг,
Як чырвоны следапыт дасведчаны...
— Як жа засталіся Вы ў жывых? —
Запытаў адчайнага разведчыка.

Усміхнууўся горка у рукаў
(Пэўна, рану закрануў балючую...):
— Гэтак часта
Смерць я сустракаў,
Што адно аднаму надакучылі...

## ПАЛОННЫ СЦЯГ
(Расказ разведчыка)

Горла драчы дзяруць.
Ад выбухаў стыне грудок.
Паказвае броды Друць.
Знясілена змоўк гарадок.

З лесу ідуць жыхары
Хаты пазнаць свае.
І певень у нечым двары,
Нібы да вайны,
Пяе.

Што ж, сонца,
Прасцяг займай!
Выходзь у спрадвечны шлях!
Разведчык
Зялёны, як май,
Трымае палонны сцяг.

Ляжаць, як «лімонкі»,
Глыжы.
Куродымна тлее смаляк.
Трафейна у бліндажы:
Што хочаш —
Лімоны, каньяк.

Ды нешта не ў смак каньяк.
І вось дарагія дары —
Нясуць саматужкі гляк

І яек капы са тры.

Ватоўкі старым аддалі —
Не змерзнем на роднай зямлі!
Малым — салодкі запас,
Забудуць гаркоту на час!

Мы сёння ў любых гасцях!
Ды чым аддзячыць французі!
Бярыце
Палонны сцяг —
Касынак хопіць на ўсіх!..

* * *

*Генадзю Бураўкіну*

Што нам
Кола сяброў завужаць,—
Скрыжаваліся
Нашы скрыжалі.
Трэба меней
Сябе заўважаць,
Трэба другу любові —
Не жалю.

...Так адзін аднаго
Паважаць,
Як пасля вайны
Паважалі!..

www.kamunikat.org

***

Пахне хлебам
Віцебская вуліца,
Падпірае неба
Смачны дым.
Вось, здаецца,
Поўня перакуліцца
Боханам пасляваенным тым,
Што прапах аерам...
...Асцюкастыя .
Мне скупыя помняцца ламкі.
...Ноч і Дзень
Брыдуць з пустымі кайстрамі.
Холад,
Голад
Ходзяць на дужкі.
...Помню,
Чэрвень ягады павыціскаў,
І на вілы —
Мурагу сумёт!
Партызан стары,
Пчаляр пад Віцебскам,
Мне штыком трафейным
Кроіў мёд.

...Яравыя зоры
Шчодра небяцца.
Зорны ураджай —
На умалот!
Не вянчайся,
Недарод
З Бясхлебіцай!
Не гарчы,
Пасляваенны мёд!
...І ад успамінаў
Мінск сутуліцца,
Не паказваў ён
Дарог бядзе.

Віцебшчына,
Віцебская вуліца
Да цябе
Заўсёды прывядзе!

* * *

Віцебшчына!
Ты лёсам
Не выпешчана —
Ты войнамі
Выпесчана.
Вораг
Крыжачыў
Твой небасхіл,
Спакой твой
Нішчыў.
...пясок магіл...
...пясок папялішчаў...

**ПОМНІК У ВІЦЕБСКУ**

Стаялі насмерць.
Запазнілася помач...
Ратнікаў першай Айчыннай вайны
Халодным жвірам акрыла поўнач.
Крывёй захлынуліся.
Хвалі Дзвіны.

...Дрымотным вечарам
Юны ліпоўнік
Па-схонах да цёплых бяжыць берагоў.
Грудзьмі засланіў сны салдацкія
Помнік
Ад куль і асколкаў
Айчыннай другой.

Паранены помнік...
Пад небам балюча
Дыміцца парваных хмурын кузлаччо.
Сястрой міласэрдзя
Наддзвінская круча
Падставіла моўчкі плячо...

* * *

А на Віцебшчыне
Даўгавечныя жыхары.
Хто не верыць,
Звярнуцца ў ЮНЕСКА
Раю.
Як на экспарт паветра:
Азёры,
Бары,
Хоць ты з раем
Спрачайся,
Партызанскі мой краю!

Пра нябесную манну
Чулі тут жыхары.
Для крутой талакі
Хата скварку хавала.
Чорны дзень
Не разлічваў на сухары,
Бо на пяты ступала
Навале
Навала.

Вегетарыянства
Было тут здаўна,
Землякам
Атлушчэнне не пагражала.
Знаді смак
Лебяды,
Крапівы,
Талакна,
Пораху прысмак,
Куродым пажараў.
Дзеда рэдка сустрэнеш —
Сівеюць бабулі адны.
Быццам сумныя сосны
У бары парадзелым яны.

Раўнапраўе з мужчынам
Войны
Далі.ім даўно:
Ад касьбы,
Малацьбы
Толькі рукі нямелі.
Гадаваць,
Бедаваць —
Мелі права адно.
І падумаць пра смерць
Часу й права
Не мелі.

А лічылі гады
Ад вайны да вайны,
Прыхваткамі
Кудзелю ўспамінаў сукалі.
...Можа, прыйдуць мужы,
Можа, прыйдуць сыны,
Можа, прыйдуць унукі,—
Чакалі...

www.kamunikat.org

**МОГІЛЬНІК ВЁСАК**

Неба!
Спагадлівым вокам зірні.
Сакавік!
Накліч навальніцу.
Людзі канаюць.
Людзі ў агні.
Ліўню крывавaму
Хопіць ліцца!

Мары
Гарацъ у агні.
Мой мілы таварыш, мой лётчык,
Вазьмі ты з сабою мяне…
Хмара!
Крылом ахіні!

Песні
Гарацъ у агні.
А конік з вайны прыскочыў,
А на сядзельцы сарочка
Уся шпігою сколата,
Уся крывёю змочана.
А чым вымываць буду,
А чым сушыць буду?
А вымыю слязрю,
А высушу думою…
Лівень,
Ласкавы, весні,
Агонь захлыні!
Казкі
Гарацъ у агні.
Казлянятачкі,
Белянятачкі,
Адамкніцеся,
Адапрыцеся…
Тупарылыя
Злыя каскі,
Маланка,
Пратні!

Калыханкі,
Паданні
Гарацъ у агні.
Сталі лапкі грэцца,
Дзе катку падзецца?..

Татары прыйшлі да нас, рабавалі, білі людзей. За лавы дзяцей закладалі ды прыціскалі, душылі іх… На полі бітва была. Вось і завецца яно Татарскім…

Пярун!
Па звычаю даўняму
Падкову вясёлкі сагні.

…Мірны звычай вясковы:
Падкова
Парог вартуе абавязкова.

www.kamunikat.org

Колькі падкоў
Чужакоў
Ржавеюць у аралλі!
Падковы гора прыносілі
Маёй зямлі...

Голасу ўласнага
Болей не ўчуюць сякеры,
Кельмы.
Чаму ж ён не гасне,
Агонь пякельны?!

...Дзень чадна датлеў,
Як счарнелы падосак.
Смутак і гнеў —
Могільнік вёсак...

Могільнік немы
Дажынак,
Дакосак...

Дзе сіроткі?
Дзе ўдовы?
Згарэў і кароткі
Месяц мядовы...

Згарэлі калыскі
І дошкі на труны.

Хай вырай блізкі
Жалобна трубіць!

Стогнуць званы.
А з якой з вайны?!
Войны ўсе прайшлі
Па маёй зямлі.
Нібы на ўтравелым дварэ,
Ракета на Месяцы

Грунт бярэ.
Месяцаход
Аблогі абмацвае.
Прагне Зямля
Інфармацыі.
Даведацца хоча
Пра суседа сусед...

Калі б пасланцы
З іншых планет
З маёй Зямлі
Грунт узялі,—
Убачылі б,
Як ён высах,
Пачулі б у ім
Пакут адгалосак,
Ачахлы прысак
Спаленых вёсак...

* * *

Навука рукае
Лаўсан і лён.
А шыбе па сэрцу —
Галінкі скробат.
У колбе
Зачынаецца эмбрыён...
Пакуль што
Яшчэ паслухмяны робат.

У лядоўнях пацее лёд.
Цёпла ад аралді.
Лысіны цёплых калод
Жывіца зрасіла.
Вар'яцее Клод,
Лётчык Ізралі,—
Хірасіма!

У мастакоў
Спалены кіламетры
Мастоў і масткоў.
А крытыкам трэба
Касмічная мерка.
Бунтуе Еўропа:
— Уцечка мазгоў! —
Амерыка.

Жмурыцца
Спелымі сотамі воск.
Босы бярэзнік
Да возера выбег.
А ў небе,
Нібыта планеты ўскрыты мозг,
Клубіцца
Атамны выбух...

www.kamunikat.org

## ПРАДВЕСНЕ У ХАТЫНІ

Сімвалічныя студні.
Сімвалічныя каміны.
Студзень даверыў
Снежныя будні
Злагаднеламу лютаму —
Без маны.

Студняў ключы
Перасмяглі.
Над камінамі —
Хмурынкі стрэх.
Ацалелыя яблыні
Помняць звяглы
Кулямётаў зганчэлы брэх.

Меднее
Перагрэтая засланка поўні —
Абгарэла з усіх бакоў.
Трывожна
Жывіцай пахнуць шпакоўні,
Чакаюць жывых шпакоў...

* * *

Відаць,
І ў цябе зашмат накіпела,
Бязбожны,
Трывожны
Дваццаты век.
У космасе,
Быццам гарлачык белы,
Расцвіў усмешкаю чалавек.

Ты ў неба ўпёрся
Антэннымі аглаблямі,
Згубіць не хочаш
Здаровы клёк.
А самалёт
Бомбу атамную губляе,
Так, як воз перагружаны
Сена клок.

Майданакі,
Трасцянцы,
Хатыні —
Крыжы пакуты
Дарог крыжавых.
Кроў стыне.
Гарачы попел пе стыпе —
Сурова грукае
У сэрца жывых.

www.kamunikat.org

Забава дзіцячая —
Ложа Пракруста!..
Гразілі небу
Чаднага неба клыкі
І ўзрослай на попеле страшным
Капусты
Да хрусту
Сціснутыя кулакі.

Не можа Зямля
Жахі памяці сцерці...
Не нафта —
Кроў свішча з ускрытых вен.
Бярозкі ў гаі,
Нібы ў лагеры смерці,—
Няволыііц абмацаў
Абразы рэнтген.

Дзіцячыя вочы
Неба прасілі,
Цені на камені
Не ажылі...
Як сэрца трывогі,
Звон Хірасімы
Б'ецца ў трывожных грудзях
Зямлі...

## ПЕРАМОГІ ІДУЦЬ ПРАЗ БЕЛАРУСЬ

Радасна зямлю
прабіла рунь,
Веснавым
абуджаная громам.
Перамога йшла
праз Беларусь —
Перамозе гэты
шлях знаемы.

Заблудзіцца
не магла ніяк:
Курганоў багата
засталося
З даўніны
ад набрыдзен-ваяк —
Напамін аб іхнім
сумным лёсе.
І калі маўчыць
сівы курган,
Новы заваёўнік
Апантаны
Запытаць бы мог
У Целяхан,
Дзе знайшло прытулак
Цела хана.

Карл Вялікі

www.kamunikat.org

Тут здрабнеў і счэз,
Тут сухі быў порах
у патронах.
Да Лясной
Употайкі праз лес
Беларусь
Вяла каня Пятрова.
І, апёкшы рукі,
Банапарт
Над Бярозай
у далоні хукаў,
Бо яму гарачку
не на жарт
Тут Студзёнка
астудзіла хутка.
...Беларусь няскораная
Шмат
За свой век
пабачыла чужынцаў.
На той свет вяла іх
Акурат
Па кароткай,
Выбітай сцяжынцы.

...Ліпеню
Было замала рук,
Каб абняць усіх
З жаданых даляў.
Перамога йшла
Праз Беларусь,
І яе
На Захадзе чакалі...
Трэба помніць —
Шчыра гавару —
Тым,
Хто ставіць наш спакой
на карту:
Перамога йдзе
Праз Беларусь!
І пра гэта
Забываць не варта!

www.kamunikat.org

## ДВАЦЦАЦЬ ПЯЦЬ

Не водбліск навальніцы
У квецені калін —
Пражэктараў нажніцы
І жураўліны клін:
XXV.

1
Над сузор'ем зорак пяцікутных
Жаўранкі ў бясхмарнай вышыні.
І зямля, ссівелая ў пакутах,
Глухне ад нязвыклай цішыні.

Паслухмяна абымшэлай студні
Б'е паклон шчаслівы журавель.
І вада ласкава вусны студзіць —
Снілася за трыдзевяць зямель...

Голас не пазнаў сябе самога.
Рэха раскашуецца ў лясах.
Па зямлі ступае
Перамога,
Веснавому дню нясе пасаг.

З-пад брывей прыветных, палінялых
Журыцца даверлівы пагляд.
Вочы хмарыць гора паланянак,
Каміноў жахлівых чорны чад.

Выцвіла, як ветразь,
Гімнасцёрка,—
Захлынаў дзевятым валам бой.
І падкова скаткі
Плечы сцёрла —
Шчасце не прыйшло само сабой.

Многа будзе сонца,
Песень многа,
Веснавой
зялёнай гаманы!
Бо
Яе Чаканасць Перамога
Заручыла з мірам шар зямны.

2
Радасці выдых,
Гукай:
«Пе-ра-мо-га!»
Сны сняць спакойна сыны.
Сад беланогі.
Вясло ля парога.
Шчодрае свята вясны!

Бацька не выдыхнуў
слова святога
З пекла блакадных балот.
Зведаў знямогу
Маўчання нямога,
Сам Перамозе
ішоў на падмогу.

Я за яго гавару

*Перамога*

Колькі ўжо год...

Час неспакойны.
Я на паравозе.
Нервы,
як ліны, рыпяць.
Мне трыццаць пяць.
Дваццаць пяць Перамозе.
Бацьку было...
трыццаць пяць...

**МІНСКУ**

Імя тваё
гукну ў прасторы,
І з даўніны,
нібы з начы,
Пяюць цымбалы,
стынуць зоры,
Звіняць калёныя мячы.
Мінск —
продак струны ціха кратаў,
Мінск —
правяраў лязо мяча.
На неба не глядзеў
з-за кратаў,
Сек лютых злыдняў
з-за пляча.

Гатова прысягнуць
Няміга
Сваім апошнім асначом,
Жыццё было
таму няміла,
Хто на цябе
ішоў з мячом.
Мінск —
лязгат стылага затвора,
Мінск —
партызанскай кулі свіст.
Крэкт

узарваных рэек хворы,
Падпольшчыка
апошні ліст...

Табе —
сівых вякоў акраса,
Суровы лёс наканаван,—
На крыжавых дарогах часу
Вартуеш ты
спакой славян.

* * *

Аплакалі вырай совы
Пад Полацкам,
Знаеш, Падуя,
Узлеску ў прыпол верасовы
Ліст пeражоўклы падае.

Раздолле турoваму рыку —
Над змоўклымі нетрамі плавае.
Чаўны бласлаўляе ў Рыгу
Сафія залатаглавая.

Даверыцца снегу полаз,
Загурбяцца весяў весніцы,—
У світцы марознай Полацк
Вачыма сінімі весніцца.

Па граю першыя
Тужаць
Праталіны белабрысыя,
Ведаюць гнёзды птушкі,
І рыбы чуюць віры свае.

Да скону сэрца скарыла
Чароту гаворка картавая.
З выраю
Доктар Скарына,
Як драч, дадому вяртаецца...

## САКОЛЬНІК

Успырхнула роднае слова падлёткам
З цёплых далоняў матчынай песні.
Падлётка прыціхлага і нясмелага
Прылашчыў за пазухай хлопчык Максімка.
Вучыў яго вышыні не баяцца,
Крылы свае давяраць
Хмарам, вятрам сустрэчным...
Падлётак смялеў і лётаў
У вырай, у край сінявокі,
Што Белаю Руссю зваўся.
Вяртаўся у горад над Волгай —
І пахлі ўздужалыя крылы
Самлелым аерам Наддзвіння,
Трывожнай зарой Наднямоння,
І косамі свіцязянак...
Як здзіўлены быў блакіт,
Калі з пляча юнака Максіма
Да сонца вольны птах ускрыліў —
З ім цяжка было сагнацца
І ўладарам захмар'я.
Паклон табе, горды Сакольнік
Беларускага крэўнага слова,
Беларускага вечнага слова,
Што ты заручыў яго з небам.
Дзякуй,
Максім Багдановіч!

## ВЯЗЫНКА

Вязынка,
Адсюль вёз
Янка,
Сын Дамініка,
Каб навекі
пагарда знікла
Да роднай мовы,
Да роднага краю,
Вёз
праз крумкачовую зграю
Вязанку
галінак надзеі,—
Каб зямля маладзела,
Каб яе
не мінала нядзеля!
Светлай хвіліны
Няма ані.
Чорныя рукі...
Чорныя дні,
Як чорныя ночы...
На рукі
Хапае мукі.
Адно без прынукі
Блакітам дзяліліся
З небам вочы...
Згарэла знічкай
Сляза скупая
На небасхіле

www.kamunikat.org

Вачэй Купалы.
Маланкі гневу
Яго асвецяць.
Крывёй варожай
Свабоду свенцяць!
Даволі цемры!
Начэй даволі!
Дрэвы — да сонца,
Людзі — да волі
Цягнуцца
праз усе стагоддзі.
Хамут абразы
Цягнуць нам годзе!
Даволі гнуцца
Вярбінай ніцай.
Нам час напіцца
З чыстай крыніцы,—
Яна прагоніць
Усю знямогу,
Напоўніць верай
У перамогу!
Дарэмна
Імперыя злая,
Вязынка,
Мела сына твайго
За пасынка!
Стаў ён
Найлюбым сынам свету.
Вязынка,
Дзякуй табе
за гэта!
Вязынка,
Ты з вечнасцю
Славай Купалы
звязана!
Зоры бяссмерця
На Янкаву хату
ўглядаюцца.
Калыска пад столлю
Зорным каўшом
Гайдаецца...

www.kamunikat.org

## СПАЛОХАНЫЯ СНЫ

Трывога ные ранай:
А дзе яны,
Сыны?
Плывуць, як вырай ранні,
Спалоханыя сны...

Што ўзяць сыны паспелі?
Ні хлеба,
Ні лайна.
Туман,
Сцялі пасцелі!
У галавах —
Вайна.

Цяпер ляцець да іх,
Ды
Захмараны шляхі.
На хустцы у Бянігны
Жалобяцца шлякі.

Лічыць гады зязюлям
У маладых барах.
Прытулак для матулі —
На ўскраіне барак...

З адчаю
Неба сшыта—
Пячэ з-пад далані,
Ад самалётаў,
Жыта,
Матулю заслані!
Старая чуе ростань.
Гадоў саскублен стог.
Дзесятак сынаў
Шосты
На сходзе,
Як вятох...

Як выпрасіла ў смерці —
У д'яблавай радні —
Два дні?..
Каб слёзы ўцерці
Па Януку...
Два дні...

...Гаротныя лясіны
Жвір свежы
Бралі ў цень.
Спазніўся ліпень.
...Сына
Хавалі ў гэты ж дзень...

www.kamunikat.org

**ВАНДРОЎНІК**

*Піліпу Пестраку*

Вандруе вандроўнік палямі,
Барамі,
Слова да слова ў кайстру збірае.
Прапахлі словы верасамі,
Самі
Ідуць на лаўца.
Шлях доўгі —
Вандроўнік выразае
Кавенькі з сукаватага ядлаўца.
Ціха лісты гарачыя кратае —
Ад адзінаццаці лістападаў рэдка
Траплялі лісты за краты.
Толькі ў барах дачакалася рэха...
Сёння
70 лістападаў
З вандроўнікам поплеч ступаюць.
Вандруе па восені,
Песню сватае
Вандроўнік —
Непапраўны юнак.
Пад пахай кавенька сукаватая
Сто першаму лістападу яна!

* * *

А выслоўе ёсць,
Шэпча дбайнасць:
«Маладосць —
Буйносць,
Старасць —
Кайнасць...»

Маладосць,
Што госць,
Птах трывожны.
Як была буйносць —
Каяцца...
можна!

## СТАРЫЯ ШПАЛЫ

Пахнуць парай
Старыя шпалы
І калючай іржою рэек.
Ім трывала
У памяць запала
Колаў дрогкае рэха.

Іх,
Чарнейшых ад качагараў,
У высозны паклалі штабель.
Адпачыць
Надышла чарга ім
Ля вакзала —
Галоўнага штаба.

Ды прадымленых,
Прамазучаных,
Не крануць іх
Цывільнай цвілі.
Паравозная песня
Пявучая
Увайшла ў іх,
Як востры цвік...

## РАНІШНІ ВЕРШ

Скрогат марознай раніцы.
Жудасна правадам.
Снегірамі —
Школьнікаў ранцы,
Віселыііікамі —
Сумачкі дам.

Шпілек
Нервовыя кропкі.
Замшы
Халёны спакой.
Цішу працялі крокі.
Сыплецца іней луской.

Позіркі бліснуць сінія,
Быццам з патайніка.
Машыны за ноч заінелі,
Як бровы адстаўніка.

Шыферным дахам —
Ватнік.
Трубы прарванай
Цвярдзее флюс.
На рэгуліроўшчыка
Глядзіць прыватнік,
Як на удава трус.

Рэгуліроўшчык

www.kamunikat.org

Носа не вешае.
Фігура,
Што й гаварыць!
Ультрасучаснаю галавешкаю
Жазло накіроўча гарыць.

Апрануты не па сезону
(Таму вось сядзі і дубей!)
Хоча пагрэцца
Каля неону
Апуджаны верабей.

Няма з замарозам
У графіка блату.
Думка адна —
Не спазніцца б ано ж...

Дольку лімонную цыферблата
Рэжа стрэлкі секунднай нож...

**ЭСКІЗ**

Пераабуваюцца афіцыянткі.
Знімаюць з ахвотаю хвартухі.
Цягнецца ў парк позні тралейбус,
На шыбах яго, як з вады,
Выплывае і зыбаецца
слова: «Кафэ».
І захмялелы вечар
Спяшаецца ўпіцца
У мякаць цёплую чорнай кавы
Белымі зубамі рафінаду.

www.kamunikat.org

* * *

Адказам сваім наганяюць тугу
Гады
Мітусні магазіннай.
Пытаюць:
— За кім Вы займалі чаргу?
Гады у адказ з весялосцю нявіннай:
— За гэтай дзяўчынкай...
— За гэтай дзяўчынай...
— За гэтай жанчынай
Займаем чаргу.

**ВЯСТУНКА МАЙГО АКНА**

Падагнана ўсё на ёй,
Прыталена.
У яе на лепшым з кажушкоў —
Чысціня завей,
Туга праталіны,
Сарамлівасць першых каташкоў,
Зімовага небасхілу знічка,
Толькі пра вясну звініць сінічка.

www.kamunikat.org

* * *

Сезона важная персона —
Асенні дождж,
Як півавар.
Пад абажурам парасона
Цьмянееецца
Дзявочы твар.

Залее ззелянела замша,
І хвартушок
Ледзь-ледзь намок.
Як курганкі вясновых замчышч,
Цяплееецца
Грудзей намёк.

Залезці ў дажджавы тралейбус,
Нібы па конкурсе прайсці.
Спрадвечнага чакання рэбус —
Чаўнок у дажджавым трысці...

* * *

Зводніца-ноч
Сарамліва ў вочы глядзіць
Разлучніку-дню...
Прыколкамі-невідзімкамі,
Як сцежка іглiцай
У бары пасля спёкі,
Падлога ўсыпана...

www.kamunikat.org

* * *

Шуміць за акном ліпоўнік,
Дзьмухаўцы аснежылі ганак.
Начуе зноў палюбоўнік,
Ці лепей сказаць —
Каханак.
Кілім на сцяне,
На канапе,
Таршэр —
Кажана пераемнік.
Мішка ў плюшавай лапе
Трымае ўспамін прыемны.
Даўно наставіла рогі
Тэлевізару тэлеантэна.
Спакой халодны і строгі
Вартуюць халодныя сцены.
Ляшчыннік са спарышамі...
Даўно быў...
Далёка дзесьці.
Адно цішыню парушаюць
Сястры маладзейшай дзеці...

**СОН**

Заржавелай рэсорай
Качка крача.
Трохтонкай
З адною фараю поўні
Буксуе ноч...
З галавы галаўня,
Як з галавешкі гарачай,
Сыплюцца іскры воч.

Трохтонка вырвалася
З цішыні шчыльнай —
Прастуе па бальшаку,
Толькі абапал
Костачкамі лічылыіікаў
Ляскаюць хаты
У насцярожаным халадку...

www.kamunikat.org

**ШЧАВУЛЬНІЦЫ**

Дуб не прыдбаў
Ані лісціначкі.
Стаіць,
Нібы Кашчэй кашчавы.
А ўжо
стракатыя хусціначкі
Збіраюць
маладое шчаўе.

Смуга дрымотная,
Злянелая
Пагоднее
Ад іх усмешак.
І пальчыкі,
Узелянелыя,
Халодзіць
козытна
Узмежак.

На поплаве
агонь уздрыгвае:
Пячы вячэру
Будзе прысак,
У дыме коні —
Дымнагрывыя.
Дым сцелецца
Па ўзлобках лысых.

Арэхаўна,
Замошша,
Плігаўкі —
Прыціхлі вёскі
ў веснім гудзе.
Дзяўчаткі ў тумане,
Як кнігаўкі,
Стамлёны адвячорак
будзяць.

www.kamunikat.org

**АКНО**

Больш на балота і лета
Жабы не ўзводзяць паклёп.
Поўня —
Бліскучай манетай,
Бяры ды гуляй у шлёп!
Рэжа спакой наваколля
Песня аб цішышы.
А пятачок,
Як і колісь,
Ад спрытных абцасаў звініць.

— Ноч,
Калі ласка, ў госці! —
Я расчыняю акно.
Быццам злуецца чагосьці,
Іржава скрыпіць яно.

Хрыпла рыпіць,
Як быццам
Прыпомніць не хоча таго,
Як прымушаў пагадзіцца
Уночы маўчаць яго.

Змазваў завесы салам,
Злянелую ліў ваду,
Каб маці не выдавала,
Калі я дамоў прыйду.

...Далёка
Маіх семнаццаць.
Звыкаю ў хаце карпець.
Можаш, акно,
Злавацца
І, калі хочаш,
Рыпець!

www.kamunikat.org

**КАНЦЭРТ**

Канцэрт мастацкай самадзейнасці
Сіламі сярэдняй школы.
У артыстаў ні кропелькі
Саманадзейнасці.
Местачкоўцам —
Часу не шкода.

Гледачы памяркоўныя абмяркоўваюць
Усё як ёсць
Нетаропка.
Лехі палолі —
Пахнуць маркоўнікам,
Маладым агурэчнікам,
Кропам.

«Лявоніха»,
Ног маладых не шкадуючы,
Абцасамі лупіць з адчаем.
— Глянь, як выладнела Мар'іна Дунечка...
— Кофту модную ў маёй пазычала...

— Каля яе ўвіхаецца Коўшалеў...
— Падводзіць дадому, кажуць...

Недзе білет запрашальны скомшылі,
У кулак заціснулі кашаль.
Бярозкі,
Вятрамі не абмалочаныя,
На сцэне нешта лапочуць па-свойму.
Дзяўчынка —
Бярозак сястра малодшая,
Чытае пра Космадзям'янскую Зою.

Цішыня напружаная
Залу запоўніла.
Здаецца,
Стала вайна за плячыма.
Маці ўздыхае:
— Столькі запомніла
І нідзе не збілася...
Малайчына...

**ЛАРОК**

Ля ларка,
Што больш на шпакоўню падобны
І з дзевяці да пяці адчынен,
Звычайна затрымліваюцца падоўгу
Кожны
Па сваёй прычыне.

Падпольных сто грам
Асушае дзядзька,
Закрашаных афіцыйным напіткам,
Пасля кароткага, змоўніцкага
«Дзякуй»
Заводзіць гаворку,
Між іншым нібыта,—

Пра тое,
Што сын яго хутка адслужыць.
Што хата новая
Шыферам крыта.

Вясновае сонца смяецца з лужын.
Водзіць дрэвы ў бакі
Ад птушынага крыку.

Старая
Булачку праганяе вадой салодкай.
Скароміну прадала,
Купіла гасцінца.
Дома ў печы капуста —
Не йсці ж у сталоўку.
Толькі б на сельпоўскай машыне
Як прымасціцца.

У «шпакоўню»
Дзявочы клопат
Заляцеў і спакой раскатурхаў.
З флоту піша сусед —
Харошы хлопец,
На факстрот запрашае
Загадчык дома культуры...

Сваіх рук саромеецца Аліна.
Яны сіверылі,
Заходзіліся,
Крэплі.
Галаруч у мароз...
Галаруч у адлігу...
Фанерныя скрынкі ўскрываліся з крэктам.

Дзядзькі ўздыхаюць:
«Дунай-дзяўчына...»
Пазіраюць ласа,
Каму пад дваццаць.
Гадае Аліна,
Ці вячэрне давучыцца,
Ці ў тэхнікум які падацца?..

**ВАРТАЎНІКІ**

Страшна зімой
На свежаку-скразняку,
Хоць, праўда, і летам
Кажух аўчынны
Самаму вынослівам у варгаўніку,
Як запас той,
Бяды не ўчыніць.

Прастукваюць пагодную цішу кійкі
На бруку,
На вуглах дамоў,
На дрэвах,—
Ходзяць звечара ўдовы-вартаўнікі,
Папярэджваюць,
Што яны не дрэмлюць.

Абгаварылі зімовай ноччу даўгой
Усё разоў па тысячы з гакам.
А новых павін не багата.
Разыходзяцца па адной,
Займаюць свой трон вартаўнічы —
Ганак.

Здалёку і дужа марудна
Дзень ідзе,
Як міліцыянер дзяжурны,
Паспачуваць не хоча.
Спіць мястэчка.
Парачка праплыве дзе-нідзе.
Ластаўчаняты над галавой засвіргочуць.
Ад ракі туман паўзе наўпрасткі,
Млявую стому
Халадком салодзіць.
На досвітку
Замармочуць вартаўнікі —
Прысніцца міліцыянер
Ці злодзей...

www.kamunikat.org

* * *

Сумна дрэмле дубальтоўка,
Зачакаліся Жаканы.
Больш не паляваць на воўка —
Воўк у лесе
Госць чаканы.

Дзе аблогі пал гарачы?
Рык замоўк
Трубы бляшанай.
З-за Урала
Пад Ушачы
Шэрага
Вязуць з пашанай.

— Ваша Шэрасць,
калі ласка!
— Ваша Ікласць,
шчыра просім! —
Казка ўсім без вас
Не казка,
Лес — не лес,
Не просінь — просінь...

І зрабіў маленькі кульцік
З воўка
Смешны мульцік-пульцік.

Заяц,
Да навін ахвочы,
Ад прагрэсу не ўцякае:
На экраны косіць вочы,
Што за воўк такі?
Цікава.

Ціха ў лесе.
Стогнуць дрэвы.
Спіць барсук,
Казуля дрэмле.
Разлянелі ўсе без меры.
Зараз меры
Прыме шэры!

Гамана ў чашчобнай прэсе:
Страх ляноту закілзае.
Воўк на тое ў цёмным лесе,
Каб пра ногі ўспомніў заяц!

www.kamunikat.org

## СТАРЫ САД

Халодных сузор'яў
Позірк сляпы —
У веснавы карагод
Не збягуцца.

У сонным садзе
Трашчаць чарапы
Яблыкаў-самазагубцаў.

Ад зімавею
Хмурыны лахман
Не абароніць
Вырай картавы.

Прыслухайся,
Як белагубы туман
Фыркае на атаву...

* * *

Вырастуць —
І разляцяцца па свеце.
Спраў маюць багата,
Заняты дзеці!
— А маці працуе?
Спагадваюць дзеці:
— Старая ўжо... тупае каля хаты...
...Гасцей прымае,
Са стала прымае.
Да стала ад печы •—
Дарога прамая!
Без клопату сумна.
І так, для ўцехі,
Няньчыць унукаў,
Поліць лехі.
Бульбу капае,
Сушыць грыбы.
Тупае,
Весялей абы!..
Спаць многа не любіць —
Даўгія ночы.

Ды толькі здзівяцца
Дзеці аднойчы,
Што нечакана наваліцца праца,
Што раптам трэба
З расой падымацца —
Даіць карову,

У печы паліць,
Высушыць дровы,
Гуркі паліць...
Ручнік карэлы,
Панура ў хаце —
Захварэла
Старая маці...

**КАЗКА**

Хутка крохне
Разгалае дрэва,
Падсякае яго
Яга.
Ратавацца Піліпку трэба,
Шчэрыць зубы
Злая карга.

Ды не хоча
Добрая казка
Аддаваць хлапчука ў бяду.
Жмурыць вока
І, калі ласка,—
Пасылае гусей чараду.

Апынуся
Не ў Беларусі,
А ў нялюбай, чужой старане,—
З добрай казкі
Добрыя гусі,
Скіньце мне вы
Па перыне!..

www.kamunikat.org

## САЛОДКАЯ ПІЛА

Зары — нямы агонь.
Асіны холад — сіні.
Белакапыты конь —
Цягнуў сумёты сівер.

Сумёт куліўся ў роў.
Рыпелі дрэў арэлі.
І жарам снегіроў
Завеі рукі грэлі.

У комін вецер лез,
Ляцеў,
Як чорт мурзаты.
Паехаў бацька ў лес,
Не дачакацца таты.

Даваў дзвярам прастор,
Заходзіў нечакана
З'інелабровы бор,
Пілой падпеpазаны.

След стылай палазні
У цемрадзі знікае.
— А ты пілу лізні —
Салодкая якая!..

Язык піла пякла,
І жмурыў бацька вочы.
Салодкая піла
Была завейнай ноччу.
...Завея прывяла
У бор гадоў забыты.

Салодкая піла.
І конь белакапыты...

www.kamunikat.org

**«БЛАКІТНЫ ДУНАЙ»**

Ад сонца
закусачная ля аўтобуснай,
Як яйка,
аблупілася...
Пытаю:
— Ваша піва добрае?
— Дагэтуль
ні з кім не білася...
Прадаўшчыца пухлашчокая
Піва з пенай
напампоўвае.
Куфлямі
ніхто не чокаецца,
Проста просяць
паўтарыць па поўнаму.
Па ўпартай
раённай традыцыі
Завецца закусачная
«Блакітным Дунаем».
На пену сур'ёзна дзьмуць,
аддыхваюцца,
Куфлі ўдумліва падымаюць.
П'юць
і на момант
ні аб чым не думаюць.
Дома
стравы прыеліся.
Топяць
у «Блакітным Дунаі»
Турботы,
непрыемнасці.
Прагрыміць грузавік —
пыл курыць за кузавам,
З-пад страхі
верабей вырвецца.
Позна вечарам
пазяхае закусачная,
Мые куфлі,
лічыць выручку...

www.kamunikat.org

* * *

Аб човен хваля паласне,
Аж заблішчаць вясёлкі.
Паклон вяслу,
Хвала вясне
І гамане вясёлай.

Паклон намокламу вяслу,
Яму шчырэць багата.
Паклон цыбатаму буслу,
Што робіць круг над хатай.

Аж святлее ўсё наўкола.
Хоць дражніся з ім вясёла:
— Бусел, бусел даўганосы,
Прапіў боты,
А сам босы...

Вястун вясны,
Вясновы цуд.
Паданне жмурыць вока:
Дзе бусел селіцца,
Той кут
Пярун абходзіць бокам.

Самотны халасцяк ідзе,
А ўбачыць на світанні
Бусла з бусліхаю ў гняздзе,
Шчаслівым бацькам стане.

Дзяўчатам як
(Успомніў ледзь)
Сачыць бусла вясною?
Ляціць —
З адзіным паляцець,
Сядзіць —
Сядзець адною.

Смялей, вясна,
Займай прасцяг.
Хай бачыць не ў самоце
Бусла з бусліхай —
Халасцяк,
Ну, а дзяўчына — ў лёце!

Хай бусел крылы развіне
Над стрэхамі,
Разорамі
У сэрцу роднай старане —
Ушаччыне азёрнай!

www.kamunikat.org

**САНЦАЛЮБ**

Прасіў у неба ясную пагоду
Шыракаскулы, смуглы, як казах.
Ад самага ўзыходу да заходу
Праходзіў поплеч з сонцам светлы шлях...

Ён выцыбаўся з усяго гароду.
На маладых шурпатых даланях
Качаў вугалле зорак па начах.
Сцярог туман, каб не забрыў у шкоду.

Ды вейкі жоўтыя згубіў. Засмяг.
Як быццам шыю не варочаў зроду —
Збычэла. Гасне захад у вачах.

Сумуе санцалюб па юных днях.
Цяпер браты пазналі асалоду
Выходзіць разам з сонцам у прасцяг.

* * *

У два вяслы вяслуюць хвалі.
Аер азяблы
Лета хваліць.
        Стой,
                задавака-лістабой,
        Ты, як бацян, насат.
        Паслухай, а калі з табой
        Мы лета летапіс назад
        Спакойна адлістаем —
        Занятак зменіш аднастайны.
...Не гладзіў ты другія хвалі,
Што веславалі, веславалі.
Качоцінай вярба рыпела.
Налёгла хвалі веславалі —
І ўдаль плылі мы:
                бераг белы,
            яна і я,
                і веснавая
Ноч,
Што для нас гасіла зоры
Ды маладыя слала травы.
Маладзічок —
Лісток лазовы —
За воблачка нырнуць стараўся.
        Сівыя весляры, вяслуйце!
        Я вам аддзячу за паслугу.
        І мне таксама дайце вёслы —
        А можа, і дагонім вёсны,

Што ўдаль сплылі...
Дасюль іх помню...
Сягоння поўня
над галавой.
Плывём удвух —
Я,
лістабой.
Вяслуюць хвалі...

**ЛЕТА**

Брывей сіло
Звяло дзяўчо.
Правей сяло,
Сяло Ваўчо...

Счубацеў хмель.
Сухмень аглух.
Хмялее чмель.
Чмялее луг...

www.kamunikat.org

* * *

Прастую да Дняпра —
Ён даў учора згоду
Усё сказаць да дня
Пра ўлоў і пра пагоду.

Забраўся Рагачоў
На ўзроўе ды на ўзвалле.
Набег варага-чоўна
Начная помніць хваля.

Раўлі ад гневу,
Ды
  дарма віры гразілі.
Правіслі невады —
Як ластаўкі,
Грузілы...

## РАКА З ТАБОЙ

Ты выходзіш,
Навальнічная,
З ракі.
Пакармі мяне,
Як беркута,
З рукі.

Выплывае недаверлівасць
Са дна.
Для мяне ты
Ці для берага
Адна?

У вачах тваіх
Юнее летні дзень.
Са смугі
Сукенку лёгкую
Надзень.

Прабіваюцца
Дзве зоркі
Праз смугу.
Ад цябе
Пагляд адвесці
Не магу...

www.kamunikat.org

* * *

Дубоў плячыстых
Тугое вецце
Сплятае з ценяў
Прывідны невад.
Адны з табою
Мы ў цэлым свеце.
Пад намі —
Хвалі,
Над намі —
Неба.

Твой позірк ціхі,
Як бераг сонны.
Віры прыціхлі
На дне дрымотным.
Ты пахнеш блізкім,
Даспелым сонцам,
Я чую сэрца твайго грымоты.

Ты ўся —
Пупышкаю дзьмухаўцовай.
А локці пахнуць
Травой прымятай.
Тваёй касынкі
Рог паркалёвы
Аб лета б'ецца,
Як лёгкі мятлік...

* * *

Метэазвадам рад,
Толькі б мне зноў
Напрарочылі
Чэрвеньскі белы град,
Босыя ногі дзявочыя...

Мокры лясок,
Пясок.
Вочы,
Як мары сінія...
Бліскаўкі паясок
Гоніцца за гаспадыняю.

Хмары цяжкой абвал,
З перуном заручонай ліўнямі.
Нерваў аголеных пал —
Высакавольтная лінія!..

Толькі таго й было:
Беглі сляды ласіныя...
Сіваваронкі крыло...
Вочы,
Як мары сінія...

## ПЕСНЯ

Над ракой сцяжынка вузкая.
Над ракой бярозы гнуцца.
Пахне снег тваімі вуснамі —
Нам ніяк не размінуцца.

Па вясне крыніца журыцца,
А мароз цалуе палка.
Веснавокая снягурачка,
Заінелая Купалка.

Ці бярозы па-над берагам,
Ці спусціліся аблокі?
Цішыня такая белая.
Звонка кліча шлях далёкі.

Рэху весела рагочацца.
Не растань, мая сняжынка.
Размінацца нам не хочацца —
На дваіх адна сцяжынка.

* * *

А быў я ў вясны палонны,
Ды стукалі шчасця колы:
Хоць восеньскі ліст зялёны,
Але не такі вяеёлы.

Абмерлі стромы, адхоны
Маіх кіламетраў прасёлы.
Мой восеньскі ліст зялёны,
Але не такі вясёлы...

Раскручваюцца рулоны
Грамоў, навальнічных вясёлак.
Як восеньскі ліст, я зялёны,
Але не такі вясёлы...

www.kamunikat.org

* * *

Я загнаў цягнікі,
Яны ў стоме рэкі павыпівалі.
Сасмылелі ў аўтобусаў
Чорныя капыты.
Вырай нецярпення майго
Захлынуліся на крутым перавале,
Рэактыўныя птахі...

У якім жа вырай ты?..

* * *

Я твой нявольнік,
Твой прыгонны,
Я вольную ў цябе прашу.
Адчайнай радасці адхоны
Я снегам смеху спарушу.

Для іншых —
Вагі раўнавагі!
З вар'яцтвам,
Сэрца, парадні,
На паншчыне тваёй увагі
Гарбець абрыдла дзень пры дні.

Упартага чакання хвалі,
Прылівы міру ці вайны,
Мяне ўсяго спаласавалі
Твайго дакору цівуны.

Ці ж мне
Маліцца на старое,
Чакаць,
Каб толькі ён не знік,—
На небе здрадлівым настрою
Тваёй усмешкі маладзік?

Імчыце,
Вольнасці фургоны!
Лашак тугі траву скубе.

Я твой нявольнік,
Твой прыгонны.
Нашто мне воля
Без цябе?!

* * *

Не па барадзе —
Па чарадзе
Смерць ідзе
Таксама, як сустрэчы.
Хай бы ты
У невядомым дзе
Першаму даверыла мне плечы.

Ад цябе б я
Не пачуў абраз,
Ад цябе б я
Не зазнаў знявагі,
Залаты запас свой цэніць час,—
Дробязі
Ён не кладзе на вагі.

Мы сябе не ведаем саміх,
Мы мінулы дзень
Хваліць ахвочы.
Дзякуй жа за век:
За цэлы міг...

Помню,
Днелі вочы...
...Па-дзявочы...

www.kamunikat.org

* * *

Свет захлынаўся ад святла.
Ступаў я ў твой гарачы след.
Была вясна,
І ты была.
Як снег, кіпеў вішнёвы свет.

Не ведаў я ні звад,
Ні здрад.
Сузор'яў распазнаў сакрэт.
Твой смех звінеў,
Яснеў пагляд
Вясновы,
Як вішнёвы цвет...

Мой дзень асеніцца ў журбе,
Ліст зжоўклы — ў забыццё білет.
Гукаў вясну,
Гукаў цябе.
Як снег, апаў
Вішнёвы цвет...

* * *

У вербалісці плёс.
У жаўталісці бераг.
І Сож, як ціхі лёс,
У хвалях ціхіх, белых.
    На сход —
    І дзень, і год.
    Свяжак хмурыны выеў,
    Спакойны параход
    Прастуе ў стольны Кіеў.
Аціхліся віры,
Удовамі — даліны.
І песні на Дняпры
Плывуць на Украіну.
    Адпачывай, клявец!
    Прапахлі сенам сені.
    Апошні дзьмухавец —
    Наіўна урасελы...
Вясло з вяслом на «вы»,
І з чоўнам хваля ў згодзе.
Твой голас веснавы
Звініць мне ў карагодзе.
    Плыве туман ляны,
    І вырай дом пакінуў.
    І грэюцца кляны
    Спякотай успамінаў...

## ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА ГОДА

1
А сцяжынка смяецца,
Бяжыць за барок,
Лепей глянь,—
Гэта выпаўзень з краю
Ці Люцыпар згубіў
З чаравіка шнурок,
Ледзьве ўцёк ён
З зялёнага раю...

2
Аглушана лясная старана.
Спраўляюць баль
Вадзянікі
Ці чэрці?
Кардыяграму сэрца
Перуна
Маланкі чэрцяць...

3
Над полем
Хмарыцца пагроза.
Галосяць трунары-вятры.
Нібыта Жанна д'Арк,
Бяроза
Гарыць
На полымным кастры.

4
Марознаму настрою рад,
На даланях
Сняжынкі важу.
А рэактыўны шаўкапрад
З хмурынкі белай
Цягне пражу...

www.kamunikat.org

* * *

Вырвалі лён,
Яшчэ не пазвозілі.
Ён
у бабках
Стаіць над возерам.
Звечарэла.
Каб не спазніцца,
Мужчына косіць іллянішча.
Лепей глянь яшчэ —
Гэта старая ў рудой спадніцы
Ці бабка
Варушыцца зябка?
Аблачынкай хусцінка
Бялее на галаве.

Чакаю,
калі сплыве...

* * *

Калі здаволіцца лістабой —
Стаяць учарнелыя дрэвы
Самі сабой.
Глядзяць і не бачаць нічога
У люстэрку чорным
Зямлі асенняй.
Рыюцца ў змроку вечара
Галіны,
Як цені,
Рыюцца ў змроку гліны
Карэнні.

**МЯККІЯ РУКІ**
(З народнага)

На белым свеце
Жылі дзве сяструлі.
Аднаго бацькі,
Адной матулі.
А лёс, як звычайна,
Дзяліў адпаведна:
Багацце — багатай,
А дзеткі — беднай!
А песня-забаўка
Ліха гукала,
А песня спявала
Сваё памалу:
— Люлі, люлі, малое,
А налета — другое.
Люлі, люлі, Несцерка,
А налета — шэсцерка!
Сястра багатырка
Узяла немаўлятка.
Малечы цётка
Стала за матку.
І год праходзіць,
Другі мінае,
Дачушку маці
Штодня ўспамінае:
«Як там яна
У багатай хаце?..»
Пайшла праведаць
Дачушку маці.
А вузкую сцежку
Сляза звужае.
Прыйшла не як маці,—
Як цётка чужая.
...А частавалі
Сытой салодкай.
Ідуць праводзіць
За рэчку цётку.
А цётка просіць
Багатую матку:
— Малую перанясу
Цераз кладку.
Малая й кажа
(А словы з дакукі):
— Мама,
А ў цёткі
Мякчэйшыя рукі...

## ТРЫПЦІХ УШАЧЧЫНЫ

1
Пацягнуўся певень,
выгнуў зацёклую шыю і
таропка крыламі залапатаў.
Так развадняк
пасля бурнай начы ляпае
сябе па кішэнях,
спадзеючыся знайсці на піва.
Мнагажэнец і валацуга,
пявун галаву закінуў,
каб песняй, сівейшай
за туманы, уславіць
наложніц, і грэбнем
гарачым, як цыркулляркай,
неба распалавініў —
сонца з захмар'я выпала
костачкай пераспелага персіка...
Уласнага голасу
не можа наслухацца певень,
хваліцца,
што сонца вызваліў,
і сам сабе пляскае.
Ну што ж, няхай пацешыцца,
покуль ягоным крылом
прыпечак не замятуць
пасля таго, як засмажаць
яечню для госця...
Сінічка пасялілася ў садзе,
сінім званочкам звініць:
— Ці ты спіш, ці ты спіш?..
Уставай, уставай!..
Белы ручнік
перакідваю цераз плячо
і, як сват,— маладых
вітаю:
сонца і раніцу.

2
Сені расчынены.
Стаю на парозе. Бяруся
рукой за вушак. Выхінаюся.
З гнязда пад страхой
вытыркнуўся падлётак,
здзіўлена на мяне паглядзеў
вялізным спалоханым вокам.
Яшчэ імгненне —
пырхнуў, у бульбенніку знік.
Вярнулася ластаўка і пытае:
— Вы не бачылі, дзе мой неслух?
Ды тут спахапілася:
— Даруйце, вылецела з галавы,
што па-ластаўчынаму
не разумееце...
Хацеў запярэчыць —
няма... паляцела...
Толькі гранёны келіх —
цвет гарбузоўніку —
ціха пазвоньвае.

У ім прасвечваецца
калматы заклапочаны
чмель...

3

Якія толькі стагоддзі
цябе не хрысцілі
ў сваіх Дняпрах, а ты
язычнікам
так і застаўся, Човен.
Каб сустрэліся пальцы ў малітве,
ты рукі выцягнуў перад сабой,
славячы бога вады,
перш чым нырнуць у хвалі.
Стары паганец,
сцісні прасмоленыя далоні
і мяне напаі з прыгоршчаў...
Не пускаюць на волю.
Прыцугляны, ты мокрым носам
торкаешся ў крыссе зялёнага
берага...

* * *

Журыцца не з рукі
Патомнаму ратаю:
У небе жаўрукі
Сваю вясну вітаюць.

Звіні,
Мая вясна,
Гукай трывожным рэхам!
Інее сівізна —
Са снегам воз праехаў.

Не абмінуў мяне —
Ашчодрыў завірухай.
У зваблівай мане
Зязюлю моўчкі слухай.

Гадоў ёй не шкада:
Налічыць,
Колькі хоча!
А як пяе вада!
Да ласкі свет ахвочы.

Забыць на ўсё гатоў
Пад шчэбет,
Звон,
Пад булькат!
Хаця ў цябе гадоў,
Як рэшты

«На зязюльку».
Змоўк рэактыўны гром,
Згубіўся ў хмарах белых.
А сталасці паром
Другі чакае бераг…

2

www.kamunikat.org

**БЯРОЗА З ЛІСТАМ ГАВАРЫЛА...**

* * *

Веюць ляскай
Вятры заходнія.
На яблыні майскай
Шпак заходзіцца.
Сплылі, як крыўды,
Зялёныя крыгі.
Шпак з асалодаю
Сушыць крылы.
Вяз зацвітае
Цветам спалоханым.
Дом на ўсе дзверы
Уздыхнуў з палёгкаю.
Сцежка да кладак
Травой пазначана.
...Дзень добры,
мама!
Паклон,
Ушаччына...

* * *

Травы
Зялёныя правы
Здаўна
Ярыла гарантуе.
Шпак,
Быццам хлопец паравы,
Прастуе ў чысціню густую.
Ільсніцца сілай сакаўной
Зямлі абнова маладая.
І шпак паблісквае спіной,
Сабе сняданак выбірае.
Прыціх
Зрунелы небакрай —
Трава з вадой загаварыла.
А мятлік,
Як анёл, што ў рай
Хацеў,
Ды не пускаюць крылы.

Праз небыццё,
Вякоў равы
Трава
Праб'ецца вастракрыла,
Бо мае ўладныя правы
Вогнебародага Ярылы.

Трава застанецца травой:
Чупрынай зашуміць густою
І над адчайнай галавой,
І над знямоглай нематою...

* * *

Што смуцен,
родны бор?

Даўно цябе не бачыў.
Ну, як твой смалазбор,
Падсочаны бядача?

А дзяцел хай дзяўбе,
Тут клопат невялікі —
Выслухвае цябе,
Як кажуць, для прылікі.

І захлынае дух
Маліннікам гарачым.
Мы зноў з табою ўдвух.
Цяпер мы болей бачым.

Да сівізны змала
Згадаў свае шляхі я.
І сочыцца смала
У набіркі глухія.

Цецеруку-царку
Хай такавішча сніцца.
А я згадаў царкву
Г тую ашчадніцу.
Цяклі так медзякі,
Цяклі на адбудову.
Званы,
нібы дзякі,
Пабомквалі часова.

Цякла смала,
Цякла
У набіркі нявінна.
Была царква,
Была,—
Засталіся руіны...

Ты нервы ўсе напні,
Як трэба перад сконам.
А потым
Будуць пні
Ахоўвацца законам!..

...Дакорам не крану,
Падзякай не зазначу,
Што дошак на труну
Для маці даў,
зямляча.

Згарбела баразна.
Навек засмяглі губы.
Над ёй шуміць сасна —
Дачка твая, мой любы.

Ты з лёсам не хітрун,
Вястун зеленачубы,
Паменей ведай трун,
Часцей кладзіся ў зрубы!..

* * *

www.kamunikat.org

Падае,
Падае лісце...
Час — малады нігіліст.
І сам ападу калісьці,
Як пераспелы ліст.
Адсякае далоні
Клянам
Лістабой.
А калі нам
З табой
Сустрэцца там,
Дзе сустрэч няма,
Дзе не выгукнеш нават:
— Ма...
Мама,
Не скажаш
«Сынок»
Таксама.

...Без просу заходзіла
Восень у сені.
Я помню голас
Песні асенняй:
«Бяроза з лістам
Усю восень гаварыла:
— А мой лісточак,
А мой зялёненькі,

Ты ж мяне пакідаеш...
— Нябось, бяроза,
Нябось, белая,
Я к табе вясной буду,
З табою шумець буду,
Цябе зяленіць буду...»

...Сёння.
Было гэта ўсё
Калісьці...
...Падае лісце...

* * *

Спіць могільнік
У духаце.
Хто часты дождж разленіць?
У нагах матулі зацвіце
Разгублены ядленец.
Абначаваць на паплавах
Грамам за ціхай рэчкай.
І матылёк у галавах
Усхліпне
Кволай свечкай.

Касой зазвоніць сенакос,
Ад палыну прагорклай.
І жылкі сінія стракоз
Заб'юцца над пагоркам.

А восень дагарыць
Датла —

www.kamunikat.org

Чакай завейных чаіц.
Вачніца ўпалая дупла
Напоўніцца адчаем...

* * *

Прамень,
Гасподу займай!
Дзень самапасам падрос.
Сонца на лета,
Зіма —
На мароз.

Зімовы сонцазварот
Сонцу дае правы.
За справу бярэцца
Год...
Закасвае рукавы.

Рупіцца
Юны год,
Год без цябе другі.
Год
Маіх злых нягод,
Год
Спалынелай тугі.

Мама...
Пад сэрцам лядзень.
Мама...
Тугу не суроч.

Мне
Самы кароткі дзень.
Мне
Самая доўгая ноч...

* * *

Шчодры голас твой
Чуў паўсюль я,
Баравін ушацкіх
Зязюля.
Што ж ты сёлета
Зычыш мала
У дзень нараджэння мамы?

Невяліка
Твaё вялічча.
Ты гадоў
Нават тых не злічыш,
Што забрала
Бяда-пабіруха,
Што адкрыла
Чорная скруха.

А гадоў тых
Было замнога
Не за морамі,
Не за барамі.

www.kamunikat.org

Не схацела дзяліцца са мною,
Мама
Гора з сабой забрала.

Мама звала цябе
*Кукулка...*
Мякка сцелеш ты,
Спаць ёй мулка.

*...Грабовы дошкі*
*Сціснулі ножкі...*
*Сырая зямля*
*На сэрца лягла...*

Сляза гаручая
Пяску адчаю
Намые.
Песня сірочая
Не адчыніць
Дзверы нямыя:
Няма ў іх клямак.
І няма тых крамак,
Дзе прадаюць мамак...

Хатуль свайго смутку,
Болю
Забіраюць матулі
З сабою.
Нам яны пакідаюць
Свет белы,
Каб зязюлі гады
Нам
Лічылі.

Зямля наша пагарбела —
Магіл хатулі
За плячыма...

* * *

У выдмах захмарных
Завея ведзьміцца.
Змрок выплывае,
Нібыта з нябыту,
І поўніць коўш
Вялікай Мядзведзіцы,
А коўш высока
Палярнай зоркай прыбіты.
Праз ноч усю доўга
Долу
Хіліцца
Коўш,
Каб выліцца
З вышыні
У мяккі кош
Досвіткавай цішыні.
Змрок агортвае
Магілу тваю
І маю душу.
Таю

www.kamunikat.org

Крыўду агорклую,—
Ніяк яе не задушу!
Змроку адчаю майго
Балюча карэць.
Наканавана так на вяку.

...А ў нашай хаце карэц
Вісеў на драўляным суку.
Мы чэрпалі з вядра нетаропка
Маладзічкоў ільдзінкі
Дзінькія
І зорак кроплі.
Ды болей карца няма ўжо,
І цвік драўляны зламаўся.
У студні памяці
Вада ўспамінаў ледзіцца.

А коўш Вялікай Мядзведзіцы
Вісіць трывала —
Палярная зорка
Трымае...

* * *

Абнашчылася вясна
Дожджыкам мглістым,
Свістам.
Шчадрэе вясны казна
Гоманам зеленалістым.
Дзумкае хрушч-нелюдзім.
Гром справіў
Зялёныя ксціны.
На ганку з мамай сядзім.
Зімовая ў мамы хусціна.

На ганках
Драмалі суботы.
А наш
Пераступалі турботы.
На людскіх
Гавелі нядзелі,
На нашым —
Зрэдчас сядзелі.
Дзумкае хрушч-нелюдзім.
Трывожна з мамай сядзім.

Кажа,
Не ўзняўшы воч,
Здаецца,
Сябе не чуе:
— А нехта ж
Першую ноч
На могільніку начуе...

**МАТЧЫНЫ ПЕСНІ**

* * *

Удава —
Бяроза без верху.
Адной бедаваць
Да веку.
Удавіная —
Доля савіная:
Што ўхопіць,
Тое ейнае.
За ельнікам,
За бярэзнікам частым
Абначавала шчасце.
На ўдаву —
Бедную галаву,
Толькі злая слава.
Без сакала пава.
Кожная,
Як скала,
Хмары густыя.
Якая яснага сакала
Пахавала,
Не знае.
Стыне
Пасцель пухавая,
Вячэра сахарная...
Поле ўдоўчына
Мядзведзь
Карчом арэць,
Барануець воўчанька...
Зялёнае поле
Засяваецца болем,
Родзіць лебядою,
Жнецца бядою...

* * *

Верабеечкі
Чы-чы, чы-чы.
А я, молада, ўсё плачучы.
Ці харты пацямнё
Бяды наяхкалі,
Што свякроў у мяне
Ніякая!
Аблачынка падталая —
Белая плотка.
Свякроў загадала
Рабіць работку.
Рабіць работку,
Ды не ў ахвотку —
Сэрца баліць:
На моры бяліць
палатно,
На лесе сушыць,
каб было ладно.
На небе качаць —
да зары канчаць.
У арэшак складаць,

як пачне халадаць...
Палатно, лайно
Ад слёз намокла,
я ж не качачка плысці па
моры.
Не лютуй, не злуй, свёкар-сівер,
я ж не сонейка хадзіць
небам сінім.
Зашумі, дубровачка, як шумела ў маі,
я ж не вавёрачка —
арэшкаў не маю.
Сама пайду дарогаю,
Голас пушчу дуброваю.
Няхай голас галасуе,
Няхай мяне мамка чуе.

* * *

Абняла вясёлка
Сем сёл
З прысёлкамі.
— Чаму, селязень,
Смуцен, невясёл,
Хіба лета золкае?
— А як жа мне быць
Вясёламу,
Не магу пазбыць
Свайго сораму.
Учора
Звячора
На моры быў,
Качачку сачыў,
Глыбіні злецiла
Лецейка.
На моры быў,
Качачку сачыў.
Сягоння рана злёцела.
Хваля белая
У бераг плёхкала,
Холадам абдало
Крыло.
Каб далёкая —
Жалю б не было.
А то ж качачка ад мяне
На трэцім кусце
Купаецца,
Ныраецца,
Мне, селязеньку,
Наругаецца.
Выграбалі весляры
Мора ў сто вясёл.
— Чаму, хлопча, гавары,
Смуцен, невясёл?
— А як жа мне быць
Вясёламу,
Не магу пазбыць
Свайго сораму.
Учора
Звячора
У сватах быў —

Дзяўчыну запіў.
Заходзіла сонейка —
Суліла ясны дзень.
А мая заранaчка сёння
За другога йдзе.
Нездарма ўначы
Сава галёкала,
Гуло
Дупло.
Каб далёкая —
Жалю б не было.
А то ж дзяўчына ад мяне
На трэцім двары
Умываецца, выціраецца,
Мне, маладому,
Наругаецца...

* * *
На куце,
Як на пакуце.
Хмель, што за сталом цвіце,
З радасцю пакумце!
Сяду я на куце,
Рукі закасаўшы.
Стаіць мілы на парозе,
Ён шапачку зняўшы.
«Дзякуй табе, мая міла,
Што не дужа біла.
Куплю табе гарчык мёду,
Конавачку піва...»
Я ўпілася на мяду,
Дамовачкі не дайду...
Ёсць у мяне маладзец,
Ён дадому завядзець...
Малады табе не роўня.
І не знойдзеш горшага.
Дай жа Бог яму здароўя
З жабіны прыгоршчыкі!..
А з цябе такой карысці!
Пачакай — пацешу...
Шапкай боцікі мне чысці,
Размятай сцежкі.
Ды старайся, чорт рагаты,
Падмятай чыста.
Сцежка колькі дзён да хаты
Западае лістам...

www.kamunikat.org

# 3

## ПАЭМА ПРЫЗНАННЯ

***

Тэма паэмы
Скразная —
Гэта
Паэма прызнання.

Прызнацца ў пашане хочацца мне
Барам,
Дзе ў партызанскім глухім будане
Смутак шчымлівы дрэмле;
Сябрам,
Што адпрэчылі сцежкі мане,
Што слоў не кідалі дарэмна.

Сябры мае шчырыя,
Гэта вы
Жадалі мне добрага шляху
Ад сэрца Азіі,
Смуглявай Тувы,
Да стольнага града тундры —
Талнаха.

У дружбы харошай
Шырокі свет.
А сонца ранняга
Яснае вока
Са шчодраю ласкай
Глядзіць услед

www.kamunikat.org

Да слыннага Брэста
З Уладзівастока.

Аблокі над стэпам
Плылі на хурал.
Тайга
Абрастала гадамі.
Рэк горных
Грымеў навальнічны харал,
І плечы сутульваў
Ссівелы Урал,
І Волга ўспаміны гайдала.

Будзілі маторы
Захмурную стынь.
Гром трос
Бліскавіц барадою.
І пяткі парэпаныя пустынь
Мільгалі
Недзе ў прадонні.

Жаданая зайздрасць,
Мне сэрца кранай,
Бунтоўнае сэрца
Ушацкага гранда.
Шалей, завіруха.
Я чую карнай,
Спякотаю смаліць
Базар Самарканда!

А новае
Побач з спрадвечным жыве,
Дрымотнага Усходу
Даўняя звычка:
Са школы
Кніжкі на галаве
Нясе малая таджычка.

Горы —
Нераспрацаваны кар'ер...
Туман злямцаваны,
Бы воўна.
А на асфальце —
У вятроў напавер —
Спакойна сохне бавоўна.

Дах свету — Памір.
Бацька крочыць з сынком.
Сынку —
Дзевяноста шэсць,
Не трынаццаць.
Сын плача,
А грозіцца бацька кійком:
— Калі навучу
Уперад не вытыркацца?!

Барозны цалінныя
Гнаў мой зямляк,
На хмарку над стэпам
Арыентаваўся.

Барозны за хмаркай
Плылі наўпрасцяк,
Ад смеху дзяўчат
Хлопец ледзь ратаваўся.

...І прыгадаеш
Пад Новы год
Гады старыя —
Сабраць у гурт бы!
А сэрцаў сяброўскіх
Сонцазварот
Развесніць ласкай
Бялюткія гурбы.

## КОЛАС НА КАМЕНІ

*Ульяне Феакціставне*
*Крышталевіч*

Колькі іх, заклятых,
Не кляні,
«Камяні растуць»,—
Дзяды сцвярджаюць.
І куды ні глянеш —
Камяні.
Камяні.
Якія ж ураджаі?!

І вядзе,
Бы ў казцы,
Парсюка
Воўк у госці да сябе —
За вуха.
І аб востры камень асака
Вострыць лёзы
Асака-разуха.

Загалосіць спуджана сава,
Лось, як князь,
Пасунецца памалу.
На адведках запяе ўдава,
Гэтак да вайны яна пяяла:
— Асаку
Пасяку,
Траву паламаю.
Мужа спаць пакладу,—•
Сама пагуляю!..
Тут шчырэлі ў лівень
І ў сухмень.
Валунамі горбіліся ўзваллі.
Працадзень,
Нібыта зайцаў цень,
Мільгануў —
І памінай як звалі!

Ураджай —
Свірэпка ды гірса.
Выручала бульба
Дробна-мала.
Васількоў даверлівых краса
На касаваротках дагарала.

Прадаваць бы кветкі —
Справа дрэнь:
Нюхай сам
Ды лесуном галёкай.
Кветкавы
Трывалы працадзень,
А да Мінска
Трошачкі далёка...

Тут,
У партызанскай старане,
Цень уласны
Нёс адплату кату.
Ды ляжаць
Валун на валуне.
Кожны з іх,
Як гарнізон закляты.

Лусце жытняй
Ведалі цану.
Ураджай
Паціху ўгору тэпаў.
Недзе абжывалі цаліну —
Залатое дно
Казахскіх стэпаў.

Выспела маліна —
Пах такі!
Захмялелі
Лесавыя далі.

Неяк цыганы-вербаўшчыкі
У куток зацішны завіталі.

Цаліну расхвальваць пачалі.
Там такія булкі,
Каравai!
Лепшая зямля
На ўсёй зямлі.
А ласункаў —
Як душа трывае!

Там не трэба ўжо
Махаць касой,
Там машынам
Не хапае працы.
Раюць «цыганы»,
Каб вёсцы ўсёй
У цалінны край
Перабірацца.

Уздыхнуў з палёгкай
Сельсавет:
«Хопіць быць
Апошнімі ў раёне!»
...Толькі ж цаліна —
Не блізкі свет.
Толькі ж у каршэнь
Ніхто не гоніць...

Край на хлеб благі,

Ды дарагі,
І яго ты
Не пакінеш с ходу.
Думалі старыя
Дзень-другі,
А пасля звярнуліся да сходу.

Каб душу не камяніў дакор,
Не смакуйце
Ячную аладку.
Парашылі сходам
Хадакоў
У далёкі край
Паслаць спачатку.

Коні,
Цягнікі.
Грузавікі
Везлі хадакоў
У край гарачы.
...Вось і стэп.
А тут абсяг такі,
Што, здавалася,
Палік убачыш...

Сцелецца сабе
Кавыль-бабыль.
Выскачыць, як мыш-палёўка,
Суслік.
Дзе тут небыліца,
Дзе тут быль,—
Цяжка развязаць
Няхітры вузлік.

А бурты —
Шырокія хрыбты,
Быццам сціртны яравой саломы.
Захлынаецца ад духаты
Зерне,
Быццам боб.
Куды там дома!

Тут такая тлустая зямля,
Хоць кладзі на хлеб
Заместа масла!
Тут прыкурыш,
Як ад вугаля,
Ад пясчынкі,
Што і ўноч не гасне.

...Сельбішча лясное —
Асавы!
Там бруіцца
Ціхая крыніца.
Зайцаў плач,
Куліканне савы
На патэльні стэпу
Толькі сніцца...

Родзіць добра ўсё

На цаліне,
Для душы адно
Не знойдзеш месца,
Хай там
І валун на валуне,—
Дома салома ядома,
А ў людзях
І сена не есца!..

Хай там
З асцюкамі праснакі!
Тут жа каравай
Глядзіць з дакорам.
Нас зямля карміла
У час цяжкі,
Пакідаць, знясіленую,—
Сорам!

...Бор шумеў
Пра клопат векавы,
Прамаўчаў ён
Пра сваю нязгоду.
Радасна сустрэлі
Асавы.
Хадакі
Звярнуліся да сходу:
— Нам шукаць
Багатае зямлі?!
Ці ж сваю
Мы самі не налюдзім?!
Ворага змялі
З сваёй зямлі,
Уцякаць ад камянёў
Не будзем!

...Край крынічны,
Звонкі,
Лесавы.
...Крушні мшэюць
З зайздрасцю тупою...
...Поле маладое...
АСАВЫ!..

Не дастаць да коласа рукою...

## СЫНЫ

*Анастасіі Фамінічне*
*Купрыянавай*

Застоллю цесна
Ад шумнай радні,
А цётка Наста
Адна ў цішыні...
Што, цётка Наста,
Праўнукаў лічыце?
Чаму ж сыноў
За стол не паклічыце?!.
Сто год Вам сёння —
Сыноўняе свята,

Радні багата,
Не месціць хата!
Хіба не ўчора,
Хіба не ўчора
Вячэраць клікалі
Усіх пяцёра,
Было пяцёра.
Было пяцёра...
Сыноў забрала
Чорнае гора.
Міша...
Пеця...
Сцёпа...
Коля...
Валодзя...
Не вернуцца
Аніколі.
Сыноў забрала
Вайна-навала.
Малодшаму
самаму
Год было мала —
Трапіць на фронт
Сыну дапамагала.
Спадманна вайна
За сыноў заплаціла:
Валодзю дадому
Памерці пусціла.
Пятро Купрыянаў...
Для маці ён —
Пеця.
І Зорка Героя
У свеце свеціць.
Туга б'ецца кнігаўкай
Зноў і зноў.
Заўчасны вырай
Паклікаў сыноў.
Сто веснавеяў,
Сто лістабоеў...
Сціскаецца сэрца матулі
Ад болю.
Лічыце гады,
Баравыя зязюлі.
З днём нараджэння
Цябе, матуля!..

КЫЗЫЛЧАНКА

*Рыме Норбу,*
*проста дзяўчыне*

Стройная, нібы
страла,
Крохкая, што кавылінка,
Сарамяжліва
сустрэла
Нас тувінка.

Добрага жадаем
дня,

www.kamunikat.org

Хочам торгу з барышамі.
Нас у юрту
гаспадыня
Запрашае.

Не разбойнікі —
сваты,
Знойдуцца такіядзе йшчэ?!
Я з усёй вясёлай
світы
Маладзейшы.

Нарачоную
маю
Браць не буду без калыма:
Стэп я маю, неба
маю —
Два кілімы.
Улуг-Хем-табуншчык
нам
Засядлае Бія з Каам[1].
Плечы ўхутае
туманам
Ён ласкава.

Задрыжэла
піяла.
Здрадлівым, тугім арканам
Гэткая ж рука пяяла
Над вякамі.
Кызылчанка,
не маўчы.
Палачанкаю са мною
Ты прымчышся ў бор
дрымучы
Над Дзвіною.
Глянула — кавыль
цвіце.
Гэткі-ж позірк закаханы
За дарамі гнаў
на свеце
Чынгіз-ханаў.
Пушчаную ўдаль
стралу
Не завернеш, не дагоніш.
Шаргункам не ныць
ад страху
Пад дугою...

СУСТРЭЧА У ТРАКАІ
*Вітаўтасу Бложа*

Нас Латвія пасябравала,
Насмешлівы
Вітаўтас Бложа.
Бяссонных начэй паравалы
Адолець

[1] Бій-Хем і Каа-Хем, зліўшыся, утвараюць Улуг-Хем (Енісей).

www.kamunikat.org

Туга
Не паможа.

І нам памагала бяседа.
І шпагі скрыжоўвалі кпіны.
А кпіны —
Павагі паўпрэды,
Не з лёсткамі знацца павінны.

Мы сёння з табой
У Тракаі,
Парнаскі барбудас,
Няўседа!
Хітрушчы свой нос
Вытыркае
З начэй красавіцкіх
Бяседа.

Густ меў,
Трэба чэсна адзначыць,
Твой цёзка —
Вітаўт Вялікі.
Да нас не дажыў ён,
Іначай
У госці б у замак паклікаў.

А замак глядзіцца выдатна,
Хоць часам няўмольна
Зблочаны.
Без архітэктурных выдаткаў,
Ён з цэглы яшчэ,
Яшчэ не блочны.

І кабінет у князя
Прасторны такі даволі!
Літфонд бы
Ні ў якім разе
Не даў яму
Плошчы болей!

Князь слова чаканнага,
Слухай,
Нам клясціся ў дружбе
Не трэба.
Адной завірухай
І скрухай
Прапрадзедаў
Лашчыла неба.

І княства Вялікага статут
Пісаўся
На шкурах бычыных,
А пасся
Рагаты статак
На землях ушацкіх,
Магчыма..

Прапродкі парадай
І казкай
Дзяліліся ў час суровы,

www.kamunikat.org

І «Статут»
На мове наскай —
Чытаю ўшацкія словы.

Па лугавінню,
Абрыўю
Хваль сініх
Рушылі войскі,—
Нёман
Табе падарыў я,
І стаў для цябе ён —
Свойскі.

Заядлай касой-літоўкай
І дзед мой,
І бацька касілі.
З дзяўчынай-літоўкай
Над валатоўкай
Нам кнігаўкі галасілі...

Пагляд твой паблажлівы
Бачу.
Ды ў прошласці
Я не звякую.
За ўсё табе,
Дружа,
Ачу,
Ці звычнае больш мне —
Дзякýю!..

...Спіць хваля берагавая.
Ля замка,
Легенда кажа,
Апоўначы
З дна ўсплывае
Куфар са скарбам княжым.

Да поўначы тут дабудзем
І княжы куфар здабудзем!

«А ты,—
Усміхнуўся Бложа,—
Адной не ўлічыў замінкі:
Той
Куфар пабачыць можа,
Грахоў у каго —
Ні пылінкі!

Тут куфар вякі чакаў пас.
Ды лепей
Махнём у Каўнас.
Там нашы,—
Кажу па сакрэту,—
У музеі чарцей
Партрэты...»

## ПІСЬМО Ў АЗЕРБАЙДЖАН

А ў гарах снягі,
Ці дажджы?
Напішы, дарагі Хаджы.
Напішы,
Дарагі Фікрэт.
Выдай
Здраднай пагоды сакрэт.
Твой Баку
На сямі вятрах,
А на дні
Сем пагод на хвіліну.
А ў гарах
Пасівелы страх
У цясніну
Штурхае лавіну.
Як гартанна гучаць гарады!
Сумгаіт,
Як студэнт,
Малады,
І сівая,
Як мудрасць,
Гянджа,—
У Гянджы
З горных хмар паранджа.
Сустракае зялёную рань
Змуражэлая Ленкарань.
Казка:
Нафтавыя Камяні
Самі выплылі з глыбіні?
Залатая падкова Баку
Каспій стомлены
Абхапіла.
Каспій,
Помню,
Як дружбаку
Усміхаўся да небасхілу...
Ёсць дзве вуліцы,
І па іх
Мне балюча-трывожна йсці,—
Землякоў імёны
Маіх,
Гэта
ДВА
З ДВАЦЦАЦІ ШАСЦІ.
Землякоў заглынулі
Пяскі,
Сталі вуліцамі
Землякі.
...Ты гасціннасці даў мне ключы.
Шчодрасць краю
Адчуць мне дазволіў;
Чуць,
Як крэкчуць карагачы,
І як плачуць
Шакалы ўначы,
Як бушуюць сады на прыволлі;
Бачу я:
Зоркі вышак гарэць,

Вышак нафтавых,
Горда ўзнятых.
Пераспелыя,
У гарах
Рвуцца ад нецярпення
Гранаты...
Паказаў ты мне
Родны край,
А цяпер —
Да мяне прыязджай!
Прыязджай паслухаць,
Фікрэт,
Свіст завей
І марозу крэкт.
Ды не думай
Ні ў якім разе,
Што загрузнем дзе-небудзь з табой.
Маем нафту сваю,
Беларускі бензін,—
На БелАЗе
Прамчымся
Дарогай любой!

У БЕЛАРУСКІМ ПОЛІТЭХНІЧНЫМ

У Беларускім політэхнічным
Выступае Аўрэліу Бусуёк.
Адменныя вершы,
Дый сам сімпатычны.
І ў момант сэрца дзявочае —
Ек!

Не трэба выратавальнага круга!
Чарнеюць ластаўкі
Юных броў...
Харошая зайздрасць
Да слаўнага друга
І ў гасцей,
І ў гаспадароў.

У Беларускім політэхнічным
Наступае Аўрэліу Бусуёк,
Вядзе этычна
Наступ лірычны
Агніста,
Як «Жок»,
Нечакана,
Як шок!

Ну што ж,
Лічы сваіх паланянак,
Іх вусны спакусныя
Словам усмеш!
Не забярэш
Да сваіх палянак,
Не пераступяць
Кодравых меж.

Ды і цябе

Не аддасць Малдова.
Яна адна
У тваёй душы.
Ты, верны рыцар
Роднага слова,
Для «паланянак»
Болей пішы!

Шкада, што тэрмін
Камандзіроўкі
Раз'ясніць хутка
Лірычны туман.
Дашлі з аўтографам
Для сяброўкі
«Сам-насам з каханнем» —
Лірычны раман!

І мой барадаты паклон
Малдове!
Прыеду і я
Пры адной умове...
Ты за пытанне
Прабач:
Ці спадабаецца
Барадач?!

## ГАЛІНКА ПАЛЫНУ

*Анатолю Чмыхалу*

Жывуць часам
Таты і хаты не помнячы.

...Пісаў у рэдакцыю
Хлопец з Поўначы,
Пісаў ні пра крыўду,
Ні пра навіну:
«Адказ не пішыце,
Прышліце
Галінку палыну...»

Чытаю пісьмо,
Запаляр'е прыгадваю.

...Сібір скаралі
Мы ўсёй брыгадаю,
Літаратурныя Ярмакі.
Высока ўзносілі пікі
Лістоўніцы —
Спакою Саян
Векавыя ахоўніцы —
Ішлі скразнякі да іх
У прымакі.

...Хвалі ад сівеару
Прытанцоўвалі.
На Енісеі —

Вада свінцовая.
А так замерзлыя азяркі
Вятры палосяць —
Чарцей загоншчыкі.
А потым пілікаюць,
Справу закончыўшы,
Галосяць настыла
Чароту смычкі.

...Нам, Толя,— помніш? —
Паказваў ты
Станцыю вечнае мерзлаты.
У лёх зледзянелы
Ідзём нясмела.
Ад холаду тут
Халадэча знямела.
(Сюды б, каго
Славаю перагрэла!)

Выходзім наверх.
Як паверыць?
Малюткі,
Неба саромеюцца
Незабудкі.

Палын перагорклы,
Але павінны
На Поўначы пахнуць
Ім
Успаміны!..

РАХМАТ

Хоць слоў удзячнасці
Шмат,
Лучае ўопамінаў лінаю
Казахскі ласкавы
РАХМАТ
Мяне з маладосцю цалінкаю.

Настой палыну
Глыну
Са смагай
Цалінна-нявіннаю.
Не,
Мне не забыць цаліну,—
Былінка трызніць былінаю!

Ляці за радком радок,
Абсягамі жураўлінымі!
За ранішні халадок
РАХМАТ мой,
Зямля цалінная!

Мой дзякуй,
Казахскі стэп,
За прынар,
За лівепь сопсчпы!
Хаця без маі.ч хвалеб
Радзіў ты
Надзённы хлеб,

Стагнаў,
Эшалоны гонячы.

РАХМАТ
За вясёлы пагляд
Насмешлівай аднакурсніцы!
РАХМАТ
За твой зарапад,—
Я зоркі лавіў
Для спакусніцы...

...Вучыла нас
Цаліна
Не спаць ад відна да цямна,
Вучыла бурты буртаваць,
Супроць павальніц бунтаваць.

Дрыготкай палаткі
Крыло,
Як нашы кашулі,
Выцвіла.
У стэпе хмурынкай плыло,
Якую маланка выцяла...

Хоць слоў удзячнасці
Шмат,
Лучае ўспамінаў лінаю
Казахскі ласкавы
РАХМАТ
Мяне з маладосцю цалiннаю.

## НАДПІС НА КНІЗЕ

*Уладзіміру Лучуку*

Чакання ўпартага чаку,
Калі ж я вырву,
Браце,
І келіх мёду
Лучуку
Налею
ў мінскай хаце?!
P. S.
Пацвердзяць
«Ева і Адам» —
Усіх дзяўчат табе аддам,
І Белавеж,
І ўсіх зуброў.
Хутчэй збірайся
ў край сяброў!

## ЧЫЛАНЗАР

Блакіт уключаю.
Гляджу
На дыктаршу маладую.
Вяшчае,
Што мала дажджу.
Я разам з ёю бядую.

І раптам — Ташкент.

www.kamunikat.org

Чыланзар.
Вачам не паверыць
Баюся.
Усмешкай пагодзіцца твар,—
А там жа
Куток Беларусі!

Ніхто цябе ў крыўду,
Ташкент,
Не дасць
Пры любым землятрусе!
Рабочыя рукі,
Цэмент —
Ташкенту
Ад Беларусі!

Мой край руйнаваўся ушчэнт,
І бомбы
Навала лускала,—
Дзяцей Беларусі,
Ташкент,
Прыняў ты,
Як бацька ласкавы.

Ты клятву даваў,
Назармат,
Скрываўленай Беларусі:
«Айчына,
Твой сын і салдат,
Дамоў з перамогай вярнуся!»

Ты бачыў дзіцячы пагляд,
Спалоханы
Злосцю пажара.
А мне не забыць
Вачанят
Вясёлага Чыланзара.

Дамы
Беларусь узвяла:
Даволі святла
І прастору.
І млела ад спёкі смала,
Смала
Партызанскага бору.

З акна аднаго,
Акурат
На трэцім паверсе кватэра,
Чатырнаццаць вачанят
Глядзелі з такім даверам!

А бацька
Зайздросна багат!
Гадуйся,
Сям'я маладая!
Чатырнаццаць вачанят,
Я столькі ж табе
Жадаю,
Шаноўнейшы Назармат!

www.kamunikat.org

## СВЯТА ПЧАЛЫ

А ластаўкі белымі грудкамі
Высвечваюць рэчку да дна...
...А мне б да цябе пагрукацца...
...А ты ўжо даўно не адна...

Дарэмна я ахкаю, айкаю
У маладой журбе!
Русалка русявая,
Вайкаю
Не мне называць цябе.

...Пагоднела неба спрадвечнае,
Аглухлае ад грымот.
І, нібы бурштын,
Прасвечвала
Праменне іскрысты мёд.

Зялёны мурог —
Настолыіікам.
Навошта нам з дубу сталы?
Ваколле на мёдзе настоена:
Сягоння свята пчалы!

Эстонія сонца выслала,
Каб раніца дзень пачала,
Шчырэла пчала прамысловая,
Са святам цябе, пчала!

Тваё незамужняе прозвішча
Забыўся я — так ляпей!
А мужняе — пад пагрозаю...
А слова — не верабей!

Туга двухвясёлкавай лодкаю
Плыве ў дзень,
Наўмысна малы.
Чаму ж ты з гаркотай салодкаю,
Шчымлівае
Свята пчалы?!

## ПРОСЬБА ДА РЫЖСКАЙ АТС

*Андрысу Веяну*

Шаноўная АТС,
Кароціш
За міляй мілю,
Прызнацца хачу табе:
Эс
Тэві мілю![2]

Дакладны бяру тэлефон,
Дакладны ведаю
Адрас.
Дзе толькі падзеўся ён,
Друг Беларусі,

[2] Эс тэві мілю *(латышск.)* — я цябе люблю.

www.kamunikat.org

Андрыс?!
Не толькі
Для светлых свят,
Ён друг і ў часы нягоды,
І рэпартаж з Дрысвят
Пісаўся не для нагоды.

А можа,
На Кубе зноў?
Латгалія кліча ўладна.
Як вернецца друг дамоў,
Скажы, АТС,
Неадкладна!
Цябе, АТС,
Прашу,
Звяжы мяне з другам верным.
А потым
Я ліст напішу.
Мы ў бок Лукомля павернем!

Няма ў Дрысвят цішыні.
Светла нябеснаму стропу,—
Навалукомля агні
Ззяюць на паў-Еўропы!

...З сабою блакнот бяры,
Што ветрам дарог абвеян,
Чакаюць цябе сябры,
Друг Беларусі,
А. Веян!

## ПАЕДЗЕМ НА ВІЦЕБШЧЫНУ, КАХАРЫ!

Паедзем на Віцебшчыну, Кахары!
Хай там успаміны світаюць!
Сустрэнуць цябе
Франтавыя сябры.
Ты помніш на шапках
Акрайчык зары? —
Зямля партызан святая!

Паедзем на Віцебшчыну, Кахары!

Сустрэчная зорка,
Світальыіа гары!
Вайна да гаркоты вяртае.
Трывогу з развагай,
Памір,
Паміры,
Юначымі днямі
Вíруюць віры,—
Зямля партызан святая!

Паедзем на Віцебшчыну, Кахары!

Крыло небалёта,
Захмар'е скары!
Прапелер вясёлкі гартае.
Халат нагадалі,
Што мне падарыў,
З сваёй цюбіцейкай

www.kamunikat.org

Кахары.

Ад сэрца дары,
Яны нагадалі...
А ўнізе бары —
Зямля партызан святая!

Паедзем на Віцебшчыну, Кахары!

**АРЛІНАЯ БАЛАДА**

Пяро арла абронена
На маладыя скалы.
Спакойнае Пароніна
Наведаў сон ласкавы.

Мяцеліца заопаная,
Ты ўжо сваё адпела!
Плывуць хмурынкі паннамі.
Шуміць
Дунаец Белы;

Перабірае ў роспачы
Каменьчыкаў ружанец.
А ўсё яшчэ мароз пячы
З падхмар'я пагражае.

Прадвесне рэвалюцыі
Змяло самадзяржаўе
Зімы!
Бунтар хвалюецца—
Ён больш не катаржанін!

Няхай сабе дунаіцца,
Між хмурых стром прастуе.
Хіба пазней дазнаецца,
Хто піў ваду крутую...

З чыйго чала,

Світальныя,
Сплывалі хмары стомы.
Чыіх вачэй
Праталіны
Развеснівалі стромы...

Світаюць Татры скронямі,
Дзень ясным вокам глянуў.
Не ведае Пароніна:
«Цо то за пан Ульянов?»

Звініць крыніца-бруіца,
Мячэўнік выгінае.
Арол на ўсход кіруецца,—
Арліць бы з ім з выгнання!

Арол крылом пагойдвае
Над кручай нелюдзімай.
Калі ўжо дзень пагодлівы
Устане над Радзімай?!

Напяты промні лінамі.
Ясней,
Блакіт прагалін!
Для дум —
Пяро арлінае.
Ля хмар
Снягоў пергамент.

Паклон арлінай вольніцы!
Вяслуй сабе шырока!
Тут
Без тугі-канвойніцы
Адзін не ступіш кроку.

Чакае грому з ліўнямі
Вясёлы куст ажыны.

Сустрэнуцца з арлінымі
Выгнанніка сцяжыны!..

www.kamunikat.org

**БРУСЕЛЬ — ЛОНДАН.**
**У ТУМАНЕ СОНЦА**
(1903)

Азызлым вымем
Морды забруселі
На сіверах расійскіх
У шпікоў.
Без вопыту
Шмат клопату
У Бруселі.
Ад іх калег бельгійскіх
Збег спакой.
Стаіць натоўп.

Паліцыя ў адчаі,
Калі ў гатэлі
«Певень залаты»
Па вечарах
«Нас не ў царкве вянчалі»
Данчак спявае,
Поўны дабраты.

З'езд рыхтавалі
Катарга
І ростань.
Б'е ў сцены
Крыгаломісты прастор.
Хапае месца ўсім
На лаўках простых.
Ёсць нават
Для прэзідыума стол.

Шуміць забыты склад.
Прамоў багата.
Дастане досціп рэплікай
Да скаб.
Дадому акуратна
Дэлегатаў
Шпікі праводзяць,
Не зблудзілі каб.

Пра лёс Радзімы
Дбаюць на чужыне,
Закутак жа чужы —
Не родны кут;
Яны,
Па кім на ростанях тужылі,
Расію хочуць
Выбавіць з пакут.

Сабраліся далёка
Ад Расіі
Балтыйскі гнеў,
Якуцкая туга.
Дажджы даірэмных слёз
Не церусілі
І літасці
У неба не прасілі.
Сібернілі бароды,

Як тайга.

Да з'езда дні
Выгнаннікі лічылі.
Не спаў начамі
Ленін малады:
Уперадзе баі,
А за плячыма —
Прашпежаныя
Трыццаць тры гады.

Каля хрыбтоў
Заснежаных Саянаў,
Дзе крэкчацца
Марозу-вусачу,
Сакол,
На Волзе ўскрылены,
Ульянаў,
Пра домік па-над Свіслаччу
Пачуў.

Пасля яму,
Выгнанніку,
З пагорын
Адкрыўся Мінск —
Дагэтуль уваччу!
На з'ездзе тут
Магіляўчанін Горын
Свой край адкрыў,
Як сэрца,
Ільічу.

Складаць
яшчэ шпікам
Даносаў сагу.
Не грэла ўтульыіай Бельгіі
Цяпло.
Паслужлівай паліцыі
За ўвагу
Падзякаваць
Хвіліны не было.

...Ла-Маншам змыла
Позірк падкалодны.
Крумкач даўно ўжо
Перажыў свой карк.
Скупы на словы
Чапурысты Лондан:
Як любіш выступаць —
Ідзі ў Гайд-парк!
Туману традыцыйнага
Даволі,
Нібы
У рэфарміста ў галаве.
І спраў даволі.
І няма патолі.
І з'езд
Не ў гавань ціхую
Плыве.

www.kamunikat.org

Эканамісты,
Бундаўцы,
Цэнтрысты
На словах дбаюць
Пра народ і край.
Чакае ўпартасць,
Пнецца ганарыстасць:
Ім белыя пальчаткі
Падавай!
«Рабочы клас?
Яго ў нас небагата...» —
Скуголяць.

Ды з грымотных барыкад
Сам
Скажа за сябе
У грозным пятым
Яго Вялікасць
Пралетарыят!

У попеле прамоў
Згасіць бы існасць.
Гавораць многа,
Не маўчаць абы.
Ды іскраўцаў
                    бясстрашных
Непахіснасць —
За полымя
Рашучай барацьбы!

Пасля
Кастрычнік
Чэрчыля нашустрыць.
А покуль лорд
Яшчэ не чуе бед,
У замку радавым
Глытае вустрыц,
Дакладна ў час
Садзіцца за абед.

Пасля
Заскача зграя
                    апантана
І лордаў,
І абскубленых князькоў;
Адчаем благаслаўлёная
Антанта
Захоча задушыць
Бальшавікоў.
А покуль
Абывацелі пасуцца,
Як табуны
Лагодных лашакоў.
...На Нёман кіне
Конніцу Пілсудскі...
...Шукацьмуць рогі
У бальшавікоў...

І будзе ліхаманка біць
Буржуяў

Ад слова баявога
«Бальшавік».
І, як Хрыста,
Фашысты раскрыжуюць
Бязбожніка —
На вуснах згасне крык.

І сцяг чырвоны
Ахіне планету.
Хто там шукае
Вечны рухавік?
І ад Зямлі
Прывет пашле
Сусвету
Космапраходца першы —
Бальшавік.

І чулі скрозь
Рабочыя кварталы,
Як Ленін
Вёў нязломных за сабой,
Ён толькі злёгку «р»
Качаў картава,
Нібыта гальку на зубах
Прыбой.

На могільніку Хейгецкім
Панылa
Лісты раняла
Мірта на пліту.
І ленінцы над Марксавай магілай
У вечнасці
Стаялі на пасту.

Ільіч
Магілу адшукаў
Адразу —
Яе не ведалі
Вартаўнікі.
Не даць
Ідэі Маркса
На абразу
Без слоў
Кляліся тут
Бальшавікі.

І, верныя
Адной вялікай мэце,
Як называў іх Ленін,
«Іскракі»
Перамаглі на з'ездзе.
На планеце
Іх будзе больш:
Яны —
Бальшавікі!

Крукоў драпежных
Аслабела крылле.
Жагнаецца
Падгалы джэнтльмен:

Ужо старому свету
Лічыць хвілі
Стары Біг Бэн[3],
Руды, цыбаты Бен...

* * *

Унізе
Аблокі —
Сувалкамі воўны,
Бусліны клёкат,
Радзіны,
Войны...

Спакою валокі
Прыгорбілі спіны.
Плывуць аблокі...
Плывуць успаміны...

Ды страх хіжавокі
Са сховішча выбег:
Клубяцца аблокі
Ці атамны выбух?!

Стараешся —
Марна! —
Маўчанне слупа мець.

Уверсе
Бясхмар'я
Халодная памяць...

[3] Біг Бен — вялікі, доўгі Бен — назва вежы з гадзіннікам каля будынка парламента ў Лондане.

www.kamunikat.org

## АДЭСКІЯ КАТАКОМБЫ

Ад цемры
завыць ваўком бы.
Гашу
слязлівую свечку.
Дыхаюць катакомбы
Холадам
сярэднявечча.
Над галавой
змяркаецца тхло,—
Ледзьве ўсхліпвае святло.
У студні
вада звечарэла.
Адсюль,
дзе быў схоў неспазнаны,
Сувязь трымалі
з днём белым
З начэй катакомб
партызаны.
Ехалі з вёскі,
лістоўкі ў вядры,
Не скараліся
баявыя сябры!
Па-даваеннаму
светлы, ветлы
На зямлю
дзень балюча глянуў.
У катакомбах
сканаў разведчык
Іваноў Іван
сын Іванаў.
Над магілай настылай,
сырой
Клятву даў
парадзелы строй:
— Калі ліхалецце мінецца
(Ноч сляпая
не будзе бясконцай),
Хто ў жывых застанецца,—
Пахавайце
пад сонцам...

www.kamunikat.org

## ВУЛІЦЫ УЛАДЗІВАСТОКА

Там, дзе высеклі кедры —
вуліца Кедравая,
Піхтавая —
дзе піхты спляжылі.
Іх лёгка кранаюць
студэнты кедамі,
Выстрочваюць шпількамі
дамы пляжныя.
Рыпяць ля Партовай
краны асверамі.
Сваячка Ціхаму —
Акіянская гордая.
Праспект Стагоддзя
паведамляе даверліва,
Што за другую сотню
пераваліла гораду.
То бягуць ля ўзбярэжжа,
дамамі бялеючы,
То на сопках,
як тыя пінгвіны валюхаюць.
Невядомыя
і вядомыя —
Лазо,
Убарэвіча,
Блюхера.

* * *

Хвалям
невады паласкаць,
Невадам —
трашчэць ад рыбы.
Як жаночая ласка,
луска
Прыстае
да злубелай робы.
Рыбакі,
спакойныя, як багі,
У гумовых батфортах.
Раўнуюць
вадзе бакі
Да салёнага,
сёмага поту.
Вада не звыкла
зважаць.
Досвіткам галубіным
Заядлы рыбак —
свяжак —
Зялёныя
будзіць глыбіні.
Нораў круты
ў вады,
Не любіць звадак.
На ніткі
парве невады,
Яе

упартаму сватаць.
Разрэжа
чаўна палазня
Хваль успененых
гурбы.
Рыбачкі на беразе
сняць
Як стэп, салёныя губы...

## МІС АЗІЯ

Прахапілася сонца.
І прамянямі сваімі раскосымі
да сонных павек дакранулася,—
Яны прачнуліся,
ад нечаканасці спалохана
крыллем залапаталі, як
птушаняты.
Глянулі вочы раскосыя здзіўлена.
Шустрыя прамянькі нырнулі ў
прадонні трывожныя і там хітрынкамі
затаіліся.
Дагэтуль.
Свецяцца...
Сонца ўзыходзіла два разы.
З-за стромых сопак паказалася першы
раз, на імгненне задумалася — спяшацца
ў дарогу ці яшчэ пачакаць, ды яго
затрымала хмурынка — твая далікатная
сукня. І другі раз затрымала таксама.
Два даспелыя сонцы
сукню паляць тваю дагэтуль, сэрца
апякаюць шчаслівуцу,
якому лёс пад добры настрой дазволіць
цябе прытуліць. Тvае галапупыя немаў-
ляты — смуглыя, бо смокчуць смагла
раткамі ружовымі два шчодрыя сонцы
і самі ля іх смуглеюць,—
міс Азія.

Калі тайфун, не помню які (у іх
жа ва ўсіх імёны жанчын пяшчотныя),
лашчыў нас, як барсук дзяцей сваіх, я
прыгадаў цябе,
міс Азія.

* * *

З дарогі збіўся
Гор караван
У вечаровай смузе.
— Гэй!
На мяне трэба кіраваць —
З правадніком балазе.

З гарбоў азяблых
Я снег страсу
З кожнага па чарзе.
І караганніку прынясу —
З правадніком балазе!

Буду я хмарамі акрываць
Цябе
У спякотны дзень...

Рэчкамі звонячы,
Караван
На голас даверліва йдзе...

www.kamunikat.org

**СПЯКОТА**

Гром перасмяглы
Нашча
Злуецца на дзень прапашчы:
Хмары
Зноў не ўзялі з азёр ясака.
З пабурэлай расколіны
Мядзведжай пашчы
Вырваўся вадаспад языка...

* * *

Клапоты па баку!
Вясёлым дзецюком
Праходжу па Баку
З Яўгенам Лецюком.

А ў бераг хваля цюк,
Паспаць рэкамендуе.
Пяе Яўген Ляцюк
Пра поўню маладую.

Чаго ж мой друг зачах?
Чаго туга ў вачах?
Чаго туга такая?
Ці не хапае нечага?
Раўнівая Данеччына
Яго не адпускае.

Ён падпісаў мне кнігу
«Трэцяе вясло».
Каб човен нашай дружбы
Плыў роўна — ўсім на зло!

Я песню ўспамінаю,
Спявала маці мне:
Па сінім па Дунаі
Плыў месяц у чаўне.

Прайшлі гады,—

Тады,
Як прыязджаў дадому,
Пыталася знаёма:
— А што ж цябе прынясло,
Ці чаўночак,
Ці вясло?..

## НА КУРШСКАЙ КАСЕ

Куршская каса —
Шабляю крывою.
Потная раса
Саляніць крывёю.

Хмуры хмарасплаў.
Бацька Нёман шчыры
Да касы праслаў
Хваль імклівы вырай,—

Каб было святла
Старане зялёнай,
Каб раса была
Не такой салёнай.

Сыпце жорсткі град,
Успамінаў жорны!
...Берагу браў атрад
Афіцэрскі,
Зорны.,

Ды палеглі ўсе.
І цяпер,
Зірніце,
Сумныя, ў расе
Травы пры граніце.

Палявы граніт.

www.kamunikat.org

Форма палявая.
Хай там сонца Нід
Пляжы залівае

Тут,
У прорве вод,
Стыне не астыне
Сум балючых год,
Як вякі ў бурштыне…

**ЗМЕСТ**

*** З-пад нахмураных броваў…
*** Рэкі ўсхадзіліся…
*** Ад сівых гадоў…
1103-ці дзень вайны
Папяровыя змеі
На сустрэчы партызан
Палонны сцяг
*** Што нам…
*** Пахне хлебам…
*** Віцебшчына!..
Помнік у Віцебску
*** А на Віцебшчыне…
Могільнік вёсак
*** Навука рукае…
Прадвесне ў Хатыні
*** Відаць, і ў цябе…
Перамогі ідуць праз Беларусь
Дваццаць пяць
Мінску
*** Аплакалі вырай совы…
Сакольнік
Вязынка
Спалоханыя сны
Вандроўнік
*** А выслоўе ёсць…
Старыя шпалы
Ранішні верш
Эскіз
*** Адказам сваім…
Вястунка майго акна
*** Сезона важная персона
*** Зводніца-ноч
*** Шуміць за акном…
Сон
Шчавульніцы
Акно

Канцэрт
Ларок
Вартаўнікі
*** Сумна дрэмле дубальтоўка…
Стары сад
*** Вырастуць...
Казка
Салодкая піла
«Блакітны Дунай»
*** Аб човен хваля...
Санцалюб
*** У два вяслы вяслуюць...
Лета
*** Прастую да Дняпра...
Рака з табой
*** Дубоў плячыстых
*** Метэазвадам рад
Песня
*** А быў я ў вясны палонны…
*** Я загнаў цягнікі…
*** я твой пявольнік…
*** Не па барадзе…
*** Свет захлынаўся ад святла..
*** У вербалісці плёс…
Штрыхі да партрэта года
*** Вырвалі лён…
*** Калі здаволіцца лістабоіі…
Мяккія рукі
Трыпціх Ушаччыны
*** Журыцца не з рукі…
Бяроза з лістам гаварыла…
*** Веюць ласкай..
*** Травы…
*** Што смуцен...
*** Падае…
*** Спіць могільнік…
*** Прамень…
*** Шчодры голас твой…
*** У выдмах захмарных…
*** Абнашчылася вясна...
Матчыны песні
Паэма прызнання
Арліная балада
Брусель — Лондан. У тумане сонца
*** Унізе…
Адэскія катакомбы
Вуліцы Уладзівастока
*** Хвалям...
Міс Азія
*** З дарогі збіўся…
Спякота
*** Клапоты па баку!..
На Куршскай касе

**Барадулін Р.**

Рум. Новая кніга лірыкі. Мн., «Маст, літ.», 1974.- 192 с.

Новую кнігу лірыкі вядомага беларускага паэта Рыгора Барадуліна склалі вершы, напісаныя за апошнія гады. Яны розныя па тэматыцы. Але іх аб'ядноўвае адно — любоў да Радзімы, маці і матчыных песень, да блізкіх і далёкіх сяброў. Як і ў папярэдніх кнігах, мова паэта ярка метафарычная, вобразная, асветленая дасціпным гумарам і павагай да чытача.

© OCR: Камунікат.org, 2010 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2010 год
© PDF: Камунікат.org, 2010 год